ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



«Ад Алімпіяды цяпер хочацца большага»



Здо́рава, калі вучні здаро́выя



Хто ўмее кіраваць гукам

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 117 (28481)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Дыялог бізнесаў

# СУВЯЗІ БРАЦКІЯ І ДЗЕЛАВЫЯ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У сталіцы ў другі раз адкрылася міжнародная прамысловая выстаўка «EXPO-RUSSIA BELARUS 2017». У экспазіцыях расійскіх і беларускіх кампаній прадстаўлены інавацыйныя распрацоўкі ў традыцыйнай, атамнай і альтэрнатыўнай энергетыцы, сельскай гаспадарцы, нафтахімічнай і газавай, харчовай прамысловасці, машынабудаванні, будаўніцтве, транспарце, медыцыне і фармакалогіі, тэлекамунікацыях і сувязі, адукацыі. Не абмінулі і тавары народнага спажывання.**

«Мы паспяхова ўзаемадзейнічаем у рамках Саюзнай дзяржавы. Сумесна працуем над прасоўваннем інтэграцыі па лініі ЕАЭС. Гэтая выстаўка і Мінскі бізнес-форум, які праводзіцца на яе платформе, уносяць карысны ўклад у далейшае раскрыццё двухбаковага гандлёва-інвестыцыйнага патэнцыялу краін. Пераканаены, што дэманстрацыя дасягненняў у самых розных галінах эканомікі і ўзаемны абмен вопытам дазволяць выйсці на рэалізацыю перспектыўных сумесных праектаў і ў цэлым будуць садзейнічаць паглыбленню расійска-беларускага супрацоўніцтва на карысць грамадзян», — гаворыцца ў пасланні міністра замежных спраў Расіі Сяргея Лаўрова з нагоды адкрыцця выстаўкі.

СТАР. 3

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# ЯК ЖАХЛІВА ЯНА ПАЧЫНАЛАСЯ...


Якуб КОЛАС
Смерць разбойнікам
Налёт

**Забітыя жанчыны і дзеці, «жывыя масты» з ваеннапалонных, па якіх пускаюць танкі, гвалт і марадзёрства — такімі былі першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны. Калі гартаеш падшыўкі «Звязды», разумееш, як мала мы пра яе ведаем. Менавіта з газетных старонак спазнаеш розныя дробныя дэталі гісторыі, што не знойдзеш ні ў якіх падручніках, улоўліваеш настрой часу, бачыш, як праяўляецца нацыянальны характар...**

## НА БАЯВЫМ ПАСТУ

24 чэрвеня варожая авіяцыя ўжо бамбіла Мінск. Рэдакцыі рэспубліканскіх газет страцілі стацыянарную паліграфічную базу. Па ўказанні ЦК Кампартыі Беларусі рэдакцыя «Звязды» выехала з Мінска і працягвала выпускаць газеты спачатку ў Магілёве, пасля — у Гомелі. Апошні нумар 1941 года выйшаў 13 жніўня...

«Бесперабойнай работай прадпрыемстваў забяспечым нашу перамогу», «Вораг будзе разгромлен!», «Нястомна каваць абаронную магутнасць радзімы», «Будзем працаваць з дзесяцярonай энергіяй», «Больш прадукцыі і лепшай якасці», «Працоўныя подзвігі», — калі глядзіш на загалоўкі, з якімі выходзіла «Звязда» ў першыя дні вайны, адчуваеш, што напачатку людзі не маглі ўявіць маштабаў трагедыі, яны верылі, што Чырвоная армія хутка спыніць ворага. На мітынгах і сходах, што праходзілі на заводах і фабрыках, людзі заяўлялі, што кожны на сваім месцы будзе імкнуцца як мага болей працаваць, павялічваўся працоўны дзень, разгортваліся стаханаўскія спаборніцтвы...

СТАР. 4

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі:**

*«У цяперашні час уся работа сістэмы ЖКГ нацэлена на зніжэнне выдаткаў. Гэта значыць на прымяненне тэхналогій, якія дазваляюць прадаставіць якасную і даступную жыллёва-камунальную паслугу з найменшым яе коштам. Самы галоўны кірунак, які мы бачым, — гэта дыверсіфікацыя відаў паліва, пераход з прыроднага газу на выкарыстанне мясцовых відаў паліва, у прыватнасці дранкі. Менавіта гэта паліва дазваляе ў аўтаматычным рэжыме ажыццяўляць цеплазабеспячэнне — на кацельным абсталяванні задзейнічана мінімальная колькасць працуючых. Другі ключавы кірунак — павышэнне энергаэфектыўнасці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9219 | ▲ |
| Еўра | 2,1404 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0320 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0738 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

# Кожны — патэнцыйны інвестар

**На мінулым пасяджэнні дэпутаты разгледзелі шэраг бюджэтных законапраектаў**

**Нацыянальны сход, як орган заканадаўчай галіны ўлады, сярод іншага мае і кантралюючыя паўнамоцтвы. Парламентарыі прымаюць бюджэт, і яны ж назіраюць за тым, каб ён выконваўся так, як было запланавана. Учора гэтаму было прысвечана адразу некалькі законапраектаў.**

### Бюджэт за 2016-ы: мэты дасягнуты

Як падкрэсліў на пачатку пасяджэння **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу,** ужо падведзены вынікі выканання рэспубліканскага бюджэту і бюджэту дзяржаўных пазабюджэтных фондаў Грамадзянскай авіяцыі, сацыяльнай абароны насельніцтва, Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў за мінулы год. Адпаведныя законапраекты ўнесены кіраўніком дзяржавы ў Палату прадстаўнікоў.

**Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах,** звярнула ўвагу на тое, што выкананне бюджэту праходзіла ў няпростых умовах, аднак тыя задачы, якія былі пастаўлены перад бюджэтам, выкананы: захаванне сацыяльнага вектара, абслугоўванне дзярждоўгу, падтрымка нацыянальнай эканомікі ў частцы кампенсацыі працэнтных ставак па крэдытах, падтрымка экспарцёраў.

### Уваход вольны

**Валерый БАРАДЗЕНЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах,** прадставіў праект закона «Аб інвестыцыйных фондах». Учора гэты дакумент, дарэчы, прынялі ў другім чытанні.

— З'яўляецца новы інструмент, і ён дазваляе любому чалавеку — нават таму, які не мае вялікага жадання разбірацца ў нюансах фондавага рынку, змяненнях індэксаў, падаражанні каштоўных папер, — станавіцца інвестарам, уступаючы ў інвестыцыйныя фонды, — коратка пераказаў парламентарый сутнасць законапраекта. — Іх працу будуць забяспечваць тыя людзі, што маюць спецыяльную падрыхтоўку, якія ведаюць, што гэта такое, і могуць ацаніць рызыкі.

### Ветэранаў стане больш?

**Алег ЛЕЎШУНОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях,** расказаў пра наваўвядзенні, якія ўносяцца ў Закон «Аб ветэранах». Па сутнасці, яны невялікія. Камітэт дзяржаўнага кантролю прапанаваў замацаваць заканадаўча такую катэгорыю, як ветэраны органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю, і надаць ім адпаведны статус. Праект закона прынялі ў першым чытанні.

— Канцэптуальных змен і дапаўненняў няма. Разам з тым заўвагі, якія паступілі або паступяць, будуць разгледжаны пры падрыхтоўцы дакумента ў другім чытанні, — паведаміў дэпутат.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

# Заўсёды лепш дыялог

**Улада зацікаўлена ў нармальным, прадуктыўным дыялогу з тымі, хто выступае за мірныя і паэтапныя дэмакратычныя змены. Адказныя асобы гатовы гутарыць, абмяркоўваць розныя тэмы з прадстаўнікамі такіх грамадскіх аб'яднанняў і партый.**

У нас прыгожая і ўтульная краіна, якую трэба зберагаць. А розныя погляды на тое, якой павінна быць дэмакратыя, — гэта ўжо і ёсць часцінка апошняй. Пра гэта не раз гаварыў і кіраўнік дзяржавы. Як і пра магчымасць размаўляць пра будучыню краіны з тымі, хто выступае за мірнае жыццё, дасягненне грамадскай згоды. Круглыя сталы, дыялог — адна з формаў падтрымання стабільнасці ў грамадстве.

У Віцебску днямі правялі круглы стол «Дэмакратыя і правы чалавека ў Беларусі». Аргкамітэт рэспубліканскага грамадскага руху «Грамадзянская згода» запрасіў на мерапрыемства прадстаўнікоў улады, грамадскіх арганізацый, ініцыятыў і партый.

Шэраг заўваг быў выказаны ў адрас прыхільнікаў рэзкіх перамен. Амаль што ўсе спікеры былі супраць такога «кроку да дэмакратыі». **Сустаршыня аргкамітэта руху «Грамадзянская згода» Арцём АГАФОНАЎ** падкрэсліў, што Беларусь — наша агульная краіна. І ад таго, наколькі мы гатовыя абмяркоўваць і супрацоўнічаць, залежыць стабільнасць у грамадстве.

Адной з важных тэм стала абмеркаванне моўнага пытання, а менавіта — як лепш прапагандаваць любоў і павагу да беларускай мовы.

Прадстаўнікі творчых саюзаў, у прыватнасці мастакі, агучылі свае праблемы. Напрыклад, чаму ў горадзе, які праславіў Шагал, параўнальна высокая плата за арэнду «метраў» майстэрняў. І як няпроста атрымаць дзяржаўную падтрымку на афармленне інтэр'ераў, удзел у мастацкім афармленні вуліц і сквераў...

**Галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Валерый МАРЧАНКА** расказаў, што круглы стол — добрая магчымасць абмяняцца думкамі людзям з рознымі палітычнымі поглядамі. Ён нагадаў, што пры мясцовым органе ўлады дзейнічае абласны каардынацыйны савет грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый.

Пасля Віцебска аналагічнае мерапрыемства запланавалі правесці ў Гомелі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Бомбу на вакзале Бруселя падарваў выхадзец з «камуны смяротнікаў»

Выканаўцам няўдалага тэракта на цэнтральным вакзале Бруселя з'яўляецца 36-гадовы мараканец, выхадзец з брусельскай міграцкай камуны Маленбек, дзе пражываюць пераважна выхадцы з Паўночнай Афрыкі. Таксама там жылі арганізатары серыі тэрактаў у Парыжы ў лістападзе 2015 года. Зламыснік Усама Зарыу нарадзіўся 12 студзеня 1981 года. У Маленбеку жыў з 2013 года. Мужчына быў вядомы паліцыі, але не ў сувязі з падазрэннямі ў тэрарызме або прыналежнасці да радыкалаў.



Бомба, якую падарваў тэрарыст, была значнай магутнасці, аднак яна не спрацавала так, як планаваў смяротнік. Своечасовае ўмяшанне паліцыі і вайскоўцаў дапамагло пазбегнуць тэракта больших маштабаў. Нагадаем, выбух на цэнтральным вакзале Бруселя адбыўся ўвечары 20 чэрвеня. У выніку інцыдэнту ніхто не пацярпеў. Тэрарыст быў застрэлены супрацоўнікамі службаў бяспекі.

### Хакеры на дзень вывелі са строю завод «Хонда»

Кампанія «Хонда» была вымушана на адзін дзень спыніць работу свайго завода ў прэфектуры Сайтама з-за кібератакі. Камп'ютарныя сістэмы, якія кантралююць вытворчую лінію, 18 чэрвеня былі заражаныя вірусам-блакавальнікам. Характэрна, што заражэнню падвергліся камп'ютары з састарэлым праграмным забеспячэннем. Даныя былі заблакіраваныя шкоднаснай праграмай-шыфравальшчыкам, а за разблакіроўку зламыснікі патрабавалі ўзнагароджанне. Аднак дзякуючы намаганням інжынераў «Хонда» работа завода была адноўленая да 20 чэрвеня. Аднадзённая затрымка каштавала выпуску некалькіх тысяч аўтамабіляў. У «Хонда» запэўнілі, што гэта нязначныя страты.

### Адзіны трохразовы ўладальнік «Оскара» за лепшую ролю перастае іграць у кіно



Адзіны трохразовы ўладальнік прэміі «Оскар» за лепшую ролю, брытанскі акцёр Дэніэл Дэй-Льюіс, больш не будзе працаваць у якасці акцёра. Сыход з прафесіі з'яўляецца яго асабістым рашэннем. Шасцідзесяцігадовы Дэй-Льюіс — адзіны акцёр, які атрымаў тры статуэткі «Оскар» у катэгорыі «Лепшая мужчынская роля». Гэта ўзнагароды за фільмы «Мая левая нага» (1989), «Нафта» (2007) і «Лінкальн» (2012). Сваю апошнюю ролю ён сыграў у карціне рэжысёра Пола Томаса Андэрсана «Прывідная нітка», якая выходзіць на экраны сёлета ў канцы года.

### Першая вакцына супраць павышанага халестэрыну гатовая да тэстаў на людзях

Медыцынскі ўніверсітэт Вены правёў выпрабаванні новай вакцыны, якая зніжае ўзровень халестэрыну. Распрацоўшчыкі ўжо маюць на руках станоўчыя вынікі тэстаў з мышамі і зараз гатовыя перайсці да клінічных выпрабаванняў. Вакцына мае толькі адну задачу — не даваць адкладанням забіваць сасуды. Гэтая вакцына можа стаць выдатнай альтэрнатывай статынам. У цэлым вакцына зніжае ўзровень «шкоднага халестэрыну» на 50% тэрмінам на 12 месяцаў, абараняючы ад атэрасклерозу.

Вядома: першая фаза клінічных выпрабаванняў закране 72 добраахвотнікі. Яна павінна скончыцца да канца года, паказаўшы, наколькі вакцына бяспечная. Пакуль у навукоўцаў ёсць асцярогі, што вакцына павысіць рызыку дыябету.

■ Блізкая ўлада

# ЗАКОННАСЦЬ І ЛЮДСКАСЦЬ

**Жыхарка Добруша Людміла Садоўская на прыём да памочніка Прэзідэнта Беларусі — інспектара па Гомельскай вобласці Юрыя Шулейкі прыйшла з некалькімі пытаннямі. Але ж самы галоўны яе клопат датычыцца змянення арганізацыі транспартнага руху паміж Добрушам і суседнім расійскім Навазыбкавым.**



Справа ў тым, што ў расійскім гарадку, які знаходзіцца на адлегласці ў паўсотні кіламетраў, у жанчыны жывуць блізкія сваякі. Аказваецца, дабрацца да найбліжэйшага населенага пункта ў іншай краіне дабрушанам сёння вельмі складана. Тры гады таму былі адменены танныя дызель-цягнікі, а міждзяржаўны аўтобусны маршрут пракладзены так, што транспарт не заходзіць у сам райцэнтр — ідзе побач з ім. Жанчына кажа, прыходзіцца стаяць на трасе і галасаваць з надзеяй, што аўтобус спыніцца. Аднак былі выпадкі, калі не было месцаў або кіроўца проста не меў жадання забраць пасажыраў. Так яна аднойчы ледзь не спазнілася на пахаванне сяброўкі.

Дарэчы, тую ж праблему маюць і іншыя 30 жыхароў райцэнтра, якія нават пакінулі подпісы пад агульным зваротам. Людміла Садоўская кажа: тры дні на трасе збірала подпісы, каб раённыя ўлады ўрэшце пераканаліся, што праблема агульная, а не толькі яе асабістая. Да таго ж у многіх дабрушан дзеці вучацца ў Расіі. Год займаецца жанчына гэтым пытаннем і пакуль што атрымлівае адказы, якія перакідваюць рашэнне з адной інстанцыі на іншую.

— І самае галоўнае — ніхто ж не супраць. Усе кажуць, што трэба рыхтаваць дакументы, узгадняць расклад руху. Сама з'ездзіла ў Навазыбкаў і спрабавала дамовіцца з мясцовымі транспартнымі арганізацыямі. Так і не разумею — чаму складана ўзгадніць расклад руху і дамовіцца з расійскімі транспартнымі арганізацыямі?

Памочнік Прэзідэнта Юрый Шулейка адразу ж даў даручэнне даследаваць праблему больш паглыблена і пры неабходнасці, улічваючы добрыя суседскія сувязі, звязацца з расійскім Навазыбкавым, і паспрабаваць, згодна з міждзяржаўнымі законамі, арганізаваць перавозку пасажыраў.

Між тым час прыёму ў Добрушы прыйшлося павялічыць удвая. 30 чалавек — а гэта і тыя, хто папярэдне запісаўся, і тыя, хто прыйшоў у апошні момант, — затрымалі Юрыя Шулейку ў Добрушы на чатыры гадзіны. Пытанні былі традыцыйныя: утрыманне жыллёвага фонду, працаўладкаванне, забеспячэнне якаснай вадой... Прыходзілі на прыём і людзі, незадаволеныя судовымі рашэннямі. Інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Шулейка гаворыць, што шэраг пытанняў могуць вырашыць непасрэдна ў зале чыноўнікі, якія прысутнічаюць на прыёме. Для іншых патрабуецца невялікі час.

— Ёсць словы «закон» і «людскасць». Імі трэба кіравацца пры прыняцці адказных рашэнняў, якія могуць паўплываць на лёсы людзей. Важна зразумець тую сітуацыю, у якой апынуўся чалавек. Спадзяюся, што мясцовая адміністрацыя хутка дапаможа жыхарам аднаго з дамоў у Добрушы вырашыць праблему з дахам, які цячэ. Мы імкнёмся максімальна зразумець чалавека і тую сітуацыю, у якую ён трапіў. Мясцовыя ўлады ў межах заканадаўчага поля імкнуцца вырашаць праблемы жыхароў. Акрамя таго, ёсць шэраг наведвальнікаў, якія ведаюць спецыфіку свайго пытання і шукаюць адказ на яго ў розных кіраўнікоў. Ім важна, каб той, хто з імі гутарыць, ім паспачуваў. Разам з тым мясцовыя ўлады разумеюць сітуацыю ў рэгіёне і аб'ектыўна, у рамках заканадаўства імкнуцца вырашаць пытанні насельніцтва. Я зусім нядаўна пабываў у Нараўлянскім і Хойніцкім раёнах. У найбліжэйшы час праведу прыём у Петрыкаве або Жыткавічах.

Падчас дыялогу разгледжаны звароты, якія датычыліся самых розных сфер жыцця. Сярод ахвотных задаць пытанне былі не толькі жыхары Добруша і Добрушскага раёна, але і Гомеля, Гомельскага раёна, Веткі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «КАЖУЦЬ, ШТО Ў МАІМ МАЛАЦЭ НЯМА ТЛУШЧУ»

**З адной з вёсак Ганцавіцкага раёна на «гарачую лінію» нашай газеты патэлефанавала мясцовая жыхарка — здатчык малака. Якраз на гэтую працэдуру ў жанчыны было шмат скаргаў, якія яна даволі эмацыянальна спрабавала нам выкласці. Галоўная праблема заключалася ў тлустасці малака. Пры прыёме прадукцыі, як сцвярджала заяўніца, ёй заніжалі гэты паказчык. А калі яна сама вазіла малако на малаказавод, выстаўленая тлустасць была вышэйшай і цалкам задавальняла здатчыцу.**

Мы не называем ніякіх дакладных звестак пра заяўніцу (у рэдакцыі яны ёсць), паколькі ў гэтай справе можа быць замешаны так званы чалавечы фактар. Ды і якім чынам газета можа праверыць тлустасць малака, якое здае жанчына? Таму мы мусілі звярнуцца па дапамогу да начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання — намесніка старшыні Ганцавіцкага райвыканкама Юрыя Лелеса. Той пагадзіўся, што ў гэтай справе ў кожнага бока можа быць свая праўда. Лепшае выйсце — правесці камісійную праверку з удзелам прадстаўнікоў мясцовай гаспадаркі, сельскага Савета і, вядома, самой заяўніцы.

— Малако ад здатчыкаў звозіцца на ферму, адкуль яго забірае малакавоз завода, — сказаў Юрый Уладзіміравіч. — Трэба праверыць прадукцыю ў самой здатчыцы, што і будзе зроблена ў найбліжэйшы час. У адзін з дзён, пасля таго, як яна выставіць малако, камісійна, з запрашэннем самой здатчыцы, будуць адабраныя пробы.

Як заўважыў далей Юрый Лелес, па паперах здадзенае раней жанчынай малако мае тлустасць 3,6 працэнта — гэта базавы паказчык, не самы горшы. Канешне, калі ён вышэйшы, малаказдатчык толькі ў выйгрышы, але пры базавым нічога не губляе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# СУВЯЗІ БРАЦКІЯ І ДЗЕЛАВЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Дырэктар мінскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Аляксандр ФЕДАРЧУК** падкрэсліў, што ў нашай краіне бачаць перспектывы сумеснай работы. «Два гады таму на аналагічнай выстаўцы было заключана больш за 60 кантрактаў. Ужо цяпер паводле папярэдніх ацэнак запланавана каля 400 дзелавых сустрэч. Мы чакаем большы эфект, чым мінулы раз», — выказаў надзею Аляксандр Федарчук. Па яго словах практычна 50% усіх праграм, якія ажыццяўляе мінскае аддзяленне БелГПП, звязаны з рэгіёнамі Расіі. «Штомесяц мы арганізоўваем туды візіты або прымаем дэлегацыі з боку Расіі. У нас падпісана больш як 70 пагадненняў. Кантакты, якія будуць наладжаны падчас гэтай выстаўкі, — залог нашай паспяховай работы ў будучыні», — дадаў ён.



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

На «EXPO-RUSSIA BELARUS 2017» прысутнічае больш за 100 расійскіх прадпрыемстваў з 30 рэгіёнаў. Прадстаўлены рэгіянальныя стэнды Уладзімірскай, Растоўскай, Пскоўскай абласцей, Вялікага Ноўгарада, Краснаярскага краю, Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі — Югры. Па асноўных напрамках супрацоўніцтва адбудуцца круглыя сталы з удзелам прадстаўнікоў профільных міністэрстваў Беларусі, упраўлення Мінскага гарвыканкама, а таксама прадстаўнікоў бізнес-супольнасці Еўразійскага эканамічнага саюза.

Адным з найбольш важных раздзелаў дзелавой праграмы прадугледжана абмеркаванне перспектыў развіцця эканамічных адносін з партнёрамі з Беларусі на ўзроўні рэгіёнаў Расіі. Будзе праведзена кантактна-кааперацыйная біржа ў фармацэ B2B, прэзентацыя рэгіёнаў і кампаній. Мерапрыемства прысвечана 25-годдзю ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Расіяй, гадавіне падпісання Саюзнага Дагавора і ўстанаўлення Дня яднання брацкіх народаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Стыхія

# ВЕЦЕР КІДАЎСЯ ДРЭВАМІ

**З прычыны праходжання ў аўторак над тэрыторыяй краіны навальнічнага фронту з парывамі ветру да 21 м/с былі зафіксаваныя шматлікія выпадкі падзення дрэў.**

Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, усяго іх было 42: у Брэсцкай (6 выпадкаў), Віцебскай (11 выпадкаў), Гомельскай (1 выпадак), Гродзенскай (4 выпадкі), Мінскай (19 выпадкаў) абласцях і Мінску (1 выпадак), у выніку якіх пашкоджаны 8 легкавых аўтамабіляў. Пацярпелых няма.

Работнікі МНС і іншых арганізацый распілавалі і прыбралі дрэвы. У Слуцкім раёне зафіксаваны выпадкі пашкоджання дахаў жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў, для вызначэння ўрону працуе раённая камісія па надзвычайных сітуацыях. Вяліся аднаўленчыя работы. Па інфармацыі «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 483 населеных пунктаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ На кантролі

# 18+: НЕПАЎНАЛЕТНІМ ЗА РУЛЁМ НЕ МЕСЦА

## Дарожная бяспека ў летні перыяд

**Матацыклісты і веласіпедысты, пакінутыя без нагляду дзеці і вадзіцелі, якія вяртаюцца з пікнікоў на прыродзе... Нягледзячы на тое, што ў цёплую пару года ўмовы надвор'я значна больш спрыяльныя для вандровак, простай сітуацыяй на дарозе назваць нельга.**

Як расказаў **старшы інспектар упраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС, маёр міліцыі Аляксандр БРУЙ,** за 5 месяцаў гэтага года на дарогах краіны адбылося 1042 ДТЗ, 175 чалавек загінулі, 1141 атрымаў траўмы. 43 аварыі здарыліся па віне матацыклістаў, 37 — з удзелам веласіпедыстаў. У першым выпадку галоўныя прычыны — перавышэнне хуткасці і язда ў нецвярозым стане, у другім — выкрыстанне навушнікаў, рух па праезнай частцы, ігнараванне спешвання на рэгулюемых і нерэгулюемых пешаходных пераходах. Аляксандр Бруй падкрэсліў, што ведаць правілы дарожнага руху павінны не толькі кіроўцы механічных транспартных сродкаў, але і ўсе астатнія ўдзельнікі руху. Што датычыцца пешаходаў, то ім варта памятаць, што святлоадбівальныя элементы патрэбныя не толькі ў апрамётнай цемры, заслірагчы сябе ніколі не будзе лішнім.

Катэгорыя, вартая асаблівай увагі, — дзеці. Сёлета ўжо адбылося 85 ДТЗ з іх удзелам, чацвёра загінулі.

— Аўтакрэсла або бустар неабходна выкарыстоўваць заўсёды, нават калі вы пад'язджаеце ўсяго два кіламетры да найбліжэйшага возера. Калі раней большасць здарэнняў з удзелам дзяцей адбываліся па іх віне, то цяпер у 70% выпадкаў прычына ў дарослых. Часцей за ўсё гэта звязана з няправільнай перавозкай дзяцей. Яшчэ адзін важны момант датычыцца непаўналетніх, якія хочуць адчуць сябе дарослымі і бяруць ключы ад бацькоўскай машыны. Нявопытнасць прыводзіць да страшных наступстваў, таму бацькам неабходна строга сачыць за падлеткамі, — адзначыў старшы інспектар.

Усё лета будзе ўзмоцнены кантроль на дарогах у святочныя і перадсвяточныя дні, будуць арганізоўвацца рэйдавыя групы да месцаў масавага адпачынку, праводзіцца тэматычныя акцыі. У сярэдзіне лета пройдзе аперацыя «Хуткасць». Супрацоўнікі ДАІ заклікаюць грамадзян быць асцярожнымі і паведамляць пра заўважаныя імі парушэнні на дарозе.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# ЛЯСЫ ПАД АХОВАЙ КАМЕР

**Пачатак года можна назваць для лясной гаспадаркі краіны спакойным, нягледзячы на засушлівы май. Па апошняй інфармацыі, у масівах, падначаленых Міністэрству лясной гаспадаркі, адбылося 49 узгаранняў. Агонь прайшоў 31 гектар тэрыторыі. Што адметна, летась на гэтую дату пацярпела ад пажараў удвая больш насаджэнняў. Сумны чэмпіён тут — Брэсцкая вобласць. Там узгаранні лясоў фіксаваліся 13 разоў на плошчы 7,5 гектара.**

Але перш чым пажар патушыць, яго трэба зафіксаваць. Раней для гэтай мэты леснікі мусілі ўздымацца з магутным біноклем на спецыяльную вышку і маніторыць добрую па памерах тэрыторыю некалькі гадзін запар. Але ўжо 70% вышак абсталяваны камерамі назірання. Сучасная тэхніка дазваляе назіраць «карцінку» ў некалькі разоў без страты якасці. А ляснік, седзячы ў памяшканні, можа сачыць у рэжыме рэальнага часу, ці не закурыўся дзесьці дымок, адначасова на некалькіх аб'ектах.

Але тэхнічныя навінкі гэтым не абмяжоўваюцца.

— Нашу матэрыяльна-тэхнічную базу сёлета папоўнілі 20 гусенічных шасі для тушэння лясных пажараў у цяжкадаступных месцах і 75 спецыялізаваных аўтамабіляў, перададзеных з балансу Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, — гаворыць **консультант упраўлення лясной гаспадаркі Мінлясгаса Аляксандр УГРЫН.** — Гэта адбылося ў адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта. А за кошт сродкаў займу Сусветнага банка рэканструкцыі і развіцця былі набыты 8 пажарных аўтамабіляў і 31 машына павышанай праходнасці.

Акрамя таго, з 1 ліпеня ў Беларусі запрацуе новае лесапажарнае дзяленне тэрыторыі па раёнах. Мяркуецца, што яно дазволіць больш аб'ектыўна планаваць аб'ёмы супрацьпажарных мерапрыемстваў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Культурны код

# Гродзенскія сезоны пані Элізы

**Аднаўлена традыцыя творчых вечарын знакамітай пісьменніцы Элізы Ажэшкі**

**З новым праектам выступіла Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага. Першы сезон распачаў «Летні баль», які прайшоў на пляцоўцы каля доміка пісьменніцы.**

Гасцей сустрэла сама гаспадыня. Яе вобраз выдатна ўвасобіла супрацоўніца бібліятэкі і сцэнарыст Вольга Багдановіч. Яна паведаміла, што летні баль падрыхтаваны ў адпаведнасці з традыцыямі таго часу — канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Дата правядзення гродзенскіх сезонаў таксама выбрана невыпадкова. Па-першае, сама пісьменніца нарадзілася ў чэрвені, да таго ж роўна 110 гадоў таму яна атрымала дыплом Ганаровага грамадзяніна Гродна.

Удзельнікі балю знаёмілі прысутных з правіламі этыкету і праводзілі майстар-класы. Наведвальнікі слухалі вершы Элізы Ажэшкі на рускай, беларускай і польскай мовах.

Ініцыятыву абласной бібліятэкі падтрымалі гродзенскія пісьменнікі, народныя ансамблі польскай песні і танца «Лехіці» і «Хабры», навучэнцы гродзенскіх каледжаў мастацтва і бытавога абслугоўвання, студэнты і выкладчыкі Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я. Купалы, музыканты і салісты абласной філармоніі, спонсары. Каб перадаць падзеі тых часоў, спатрэбілася падрыхтоўка, якая доўжылася некалькі месяцаў.

На думку мясцовых улад, новы праект зойме пачэснае месца ў брэндавых мерапрыемствах Гродна і будзе карыстацца поспехам як у гараджан, так і турыстаў.



❍ У ТЭМУ:

**Эліза Ажэшка, вядомая беларуская і польская пісьменніца, нарадзілася на Гродзеншчыне, дзе правяла ўсё жыццё, пахавана ў Гродне. Вуліца, дзе стаіць яе дом, названа яе імем, тут пастаўлены помнік пісьменніцы. У 1905 годзе была ў ліку намінантаў на Нобелеўскую прэмію, як і Леў Талстой, але ўзнагароду атрымаў Генрык Сянкевіч. Самы вядомы яе раман — «Над Нёманам».**

Атмасферу былых часоў удала ўвасобілі пары ў адпаведным адзенні. Уражвалі і пышныя сукенкі дзяўчат, і строгія фракі хлопцаў. Касцюмы падрыхтавалі маладыя гродзенскія дызайнеры. На адну сукенку спатрэбілася 8 метраў тканіны і 25 метраў стужак і карунак. Пары танцавалі паланэз, кадрыль, вальс, польку. Удзельнікі Дарэчы, спецыяльна на баль прыехалі госці з літоўскага горада Друскінінкай. Турыстка з Нідэрландаў зняла свята на відэа, каб паказаць сваім суайчыннікам.

Наведвальнікі балю маглі пачытаць, уладкаваўшыся на пледах, пакаштаваць гарбату на лекавых травах па рэцэпце Элізы Ажэшкі. Прысутныя гулялі ў кракет і лато, рабілі старадаўнія прычоскі, выпрабоўвалі свой лёс у латарэі. Дарэчы, сабраныя ад гэтага грошы пойдуць на навагоднюю дабрачынную ёлку для дзяцей-сірот. Гэту традыцыю, якую заклала Эліза Ажэшка, таксама ўзнавілі работнікі бібліятэкі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай

# ПРАКЛЁН ВАЙНЕ

## Новая экспазіцыя захоўвае мноства гісторый няпростых лёсаў абаронцаў Брэсцкай крэпасці

**Сёння ў Брэсце адзначылі 76-ю гадавіну пачатку вайны. Па традыцыі, якой ужо паўвека, на досвітку ў крэпасці прайшоў мітынг-рэквіем. Пасля ўрачыста-жалобнай цырымоніі адбылася маштабная рэканструкцыя падзей чэрвеньскага дня 1941 года. На ўсіх мерапрыемствах шмат гаварылася пра памяць, якая павінна аб'ядноўваць людзей у іх імкненні захаваць мір. На гэта накіраваная і канцэпцыя самага новага музея крэпасці. Экспазіцыя пад назвай «Музей вайны — тэрыторыя Міру», адкрытая роўна тры гады таму пры фінансавай падтрымцы расійскага «Газпрама» ў Паўднёва-ўсходняй казарме крэпасці, ужо ў назве сваёй захоўвае канчатковую і найвышэйшую мэту ўсёй работы.**


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

### Лічбы, факты, наведвальнікі

Варта сказаць, што музей гэты вельмі сучасны, знаёміцца з экспанатамі, дакументамі, звесткамі можна з дапамогай інфармацыйных тэхналогій. Многія відовішчныя моманты ўражваюць, але не гэта галоўнае. Галоўнае — гісторыі, факты. Ну вось, напрыклад, экскурсавод прыводзіць такі факт для роздуму. Як вядома, у 41-м на вайну прызывалі ўжо юнакоў 1923 года нараджэння, тых, каму споўнілася васямнаццаць. Дык вось, са ста франтавікоў згаданага года нараджэння ў жывых застаўся толькі адзін...

Нават калі ні пра што болей не гаварыць, то адна толькі гэта лічба можа расказаць пра маштаб трагедыі і меру чалавечага гора, якое перажыў наш народ. **Загадчыца экспазіцыі Алена ГРЫЦУК** успамінае наведвальнікаў мемарыяльнага комплексу, якія пабывалі тут год, два, а то дзесяць гадоў таму, але асабліва запомніліся. І ў першым шэрагу іх — турыст з Уладзівастока. Мужчына гадоў 50 вельмі ўважліва вывучаў надпісы на стэндах, з цікаўнасцю слухаў экскурсавода, задаваў пытанні. А потым расказаў, як яшчэ ў школьным дзяцінстве прачытаў кнігу Сяргея Смірнова пра Брэсцкую крэпасць. І гэты твор пакінуў такое моцнае ўражанне ў яго юнай душы, што тады нарадзілася мара пабываць тут, убачыць усё на свае вочы.

А яшчэ запомнілася сям'я з Екацярынбурга: бацька і дзве дзяўчынкі-школьніцы, яны хадзілі па аб'ектах Брэсцкай крэпасці гадзіны чатыры, а то і болей. Галава гэтай сям'і расказаў, што кожнае лета яны выбіраюцца ў нейкую мясціну, звязаную з гісторыяй былой вялікай радзімы.

І зусім нядаўна вось у гэтым музеі Алену Яўгенаўну здзівіла група не зусім звычайных экскурсантаў — навучэнцаў Кобрынскай дзіцячай вёскі. Нярэдка школьнікі падчас экскурсій бываюць не вельмі ўважлівыя, а гэтыя так захоплена слухалі! Было відаць, што ім цікава, яны перапытвалі, вярталіся да экспанатаў, якія іх нечым здзівілі ці ўразілі.

### Трагедыя палону

У дзвюх залах музея прадстаўлены матэрыялы па трагедыі палону. Пры ўваходзе ў адну з іх нас сустракаюць вязні — манекены, апранутыя ў «форму» палонных. Усе ўзоры адзення сапраўдныя, прывезеныя з розных лагераў. І фотаздымкі, і лёсы... Некалькі ваенных урачоў, што ў лагеры «Рэвір» і іншых лагерах ратавалі жыцці параненым, хворым таварышам, рабілі паспяховыя аперацыі, можна сказаць, у антысанітарных умовах. Адзін з урачоў, які на фотаздымку з прыгожай малой дачушкай, не вытрымаў жудасных умоў і атмасферы прыніжэння, скончыў жыццё самагубствам. Такіх было нямала. І ніхто ім — не суддзя. Дастаткова паглядзець карціну Анатоля Каралёва «Фашысцкая цывілізацыя», якую аўтар падарыў музею. Ён сам прайшоў цераз палон. Пачаў пісаць работу яшчэ там, у лагеры. Эскізы рабіў кіёчкамі на пяску. Потым нехта даў шматок паперы і агрызак алоўка. Зарысоўваў фрагменты на паперы, потым скручваў яе і хаваў пад каўнярам. Бо каб знайшлі, замалёўкі маглі б дорага абысціся аўтару. А потым, калі ўсё гэта скончылася, доўгія гады не мог сабрацца з духам, каб завяршыць карціну. З часам вырашыў, што гэта яго абавязак. І дапісаў работу. Ад эскізаў да завяршэння прайшло 29 гадоў.

### Гістарычны здымак

У многіх альбомах, буклетах, прысвечаных вайне і абароне Брэсцкай крэпасці, ёсць рэпрадукцыя фотаздымка Міхаіла Ананьіна пачатку 60-х гадоў, на якім чалавек без нагі прыпадае да муроў крэпасці. На гэтым здымку Уладзімір Фурсаў. У гарнізоне крэпасці ён праходзіў тэрміновую службу, калі пачалася вайна. У першыя дні быў цяжка паранены, рухацца не мог. Па гэтай прычыне трапіў у палон. Яго прывезлі ў лагер «Рэвір» пад самым Брэстам. Там пачалася гангрэна. Ваенурач Іван Махавенка правёў ампутацыю нагі. Потым бязногага салдата пераvялі ў лагер пад Бялай Падляскай, былі іншыя лагеры. Вызвалілі Фурсава толькі ў 1945 годзе. Пасля лячэння ў шпіталі салдат накіраваўся дадому. Выйшаў з цягніка і на пероне ўбачыў маці. Яна памкнулася да яго... і назвала Георгіем. Так звалі малодшага брата. «Я ж твой старэйшы, Уладзімір, мама», — паспеў вымавіць, і маці страціла прытомнасць. Яна атрымала па сутнасці пахавальную, ліст з паведамленнем, што сын прапаў без вестак. А на вакзал прыйшла сустракаць малодшага — Жору. Яны былі вельмі падобныя, да таго ж абодвух не бачыла столькі гадоў. Маці апрытомнела, абняла сына, а калі праз пару гадзін прыбыў іншы поезд і на перон выйшаў Георгій, маці ўбачыла, што ў малодшага няма левай нагі. Такім чынам, абодва яе сыны вярнуліся, на дваіх у іх было дзве нагі...

Алена Грыцук гаворыць пра ўсплёск цікавасці маладога пакалення да падзей вайны. Па-першае, амаль ва ўсіх сем'ях ёсць дзед, прадзед, якія ваявалі. І нашчадкі імкнуцца даведацца пра родзіча больш, а заадно пра час і падзеі. Па-другое, у свеце надта неспакойна, войны не канчаюцца, іх становіцца больш. Значыць, чалавецтва неахвотна вучыцца ў гісторыі. Таму і патрэбныя музеі вайны як тэрыторыя міру хоць бы на прасторах асобна ўзятай чалавечай душы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# ЯК ЖАХЛІВА ЯНА ПАЧЫНАЛАСЯ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

І ў той жа час краіна жыла па законах ваеннага часу: 10 гадоў турэмнага зняволення — за сыход з працы, а п'яным зачыншчыкам бойкі ў сельсавеце — расстрэл. Работу на сваім працоўным месцы людзі ўспрымаюць як баявое заданне. Так, газета расказвае пра дзяўчыну-тэлефаністку, якая працягвала сваю справу на камутатары, нават калі чутно было, што ў вёсцы, дзе яна знаходзілася, ідзе бой з немцамі.

Праз старонкі газеты абвяшчаецца паляванне на дыверсантаў і шпіёнаў, якія могуць быць закінуты на нашы землі. Здраднікамі называюць «балбатуноў», газета заклікае быць асцярожнымі і нічога не расказваць незнаёмым людзям.

Актывісты дзяжураць на дарогах і ў вёсках, правяраюць кожнага невядомага чалавека, часам і асобныя людзі выкрываюць шпіёнаў. Напрыклад, газета расказвае, што стары вартаўнік калгасных палёў затрымаў дыверсанта, які наносіў на карты розныя аб'екты з мэтай далейшага іх знішчэння.

### ЛЮДАЕДЫ

Як мяняецца голас «Звязды» ўсяго за два тыдні! Якія моцныя падбіраюцца словы, каб узняць людзей на барацьбу. З першых дзён вайны беларускія пісьменнікі дасылалі сюды свае творы. Так, вершы Якуба Коласа «Шалёнага пса — на ланцуг» і Пятра Глебкі «Смялей у бой!» выйшлі ў «Звяздзе» яшчэ 23 чэрвеня... Кузьма Чорны пры дапамозе мастацкага слова апісваў жахі часу, заклікаў уставаць на абарону роднай зямлі, паказваў, як вайна мяняе людзей. Так, у адным з артыкулаў ён распавядае пра 13-гадовую дзяўчынку, якая ідзе ў калоне бежанцаў. Яна страціла сваю сям'ю, але пры гэтым узяла пад апеку двух такіх жа адзінокіх малых.

У многіх матэрыялах гаворыцца пра тое, што фашысты гвалцяць жанчын, здзекуюцца нават з 13—14-гадовых дзяўчынак, часта на вачах у іх родных. Уласныя інфарматары расказваюць пра тое, як рабуюцца гарады і вёскі, прычым вораг забірае ўсё — ад прадуктаў, скаціны да пабытавых рэчаў. Марадзёры валаклі нават ручнікі і дзіцячыя кашулі. Акрамя звестак Савецкага інфармбюро і інфармацыі з мясцін баёў, у газеце размяшчаюцца расказы людзей, што вырваліся з акружэння ці ўцяклі з палону. З артыкулаў у «Звяздзе» даведваешся пра такое, што кроў стыне ў жылах. Разгромлены танкамі радзільны дом і трупы жанчын, якія прыціскаюць да грудзей прастрэленых немаўлят. Абезгалоўленыя ці рассечаныя целы старшынь калгасаў, афіцэраў і іх жонак. Масавыя забойствы і зверыныя здзекі. Людзей расстрэльвалі, калолі штыкамі, палілі. Вcase... Ваеннапалонным адразалі вушы, выколвалі вочы, адрывалі ці ламалі рукі і ногі, раздушвалі танкамі. Прычым у газеце змешчаны артыкулы і пра падобныя здзекі з старых, дзяцей і жанчын.

Чым далей гартаеш старонкі «Звязды», тым больш жахаешся. Вельмі цяжка паверыць, што такое было ў першыя дні баёў. Што для простых людзей, якія яшчэ не тое што ніякага адпору не давалі, а ўпершыню бачылі ворага, вайна пачыналася з катаванняў. Мімаволі задаешся пытаннямі, што ж гэта было, чаму так жахліва? Адкуль столькі лютасці, звярства да мірнага насельніцтва і хто выканаўцы падобных дзікунскіх аперацый?

### ПАДНЯЛАСЯ БЕЛАРУСЬ

*«Праязджаючы ад Коўна, я бачыў сам, як над дарогай, на якой нікога не было, апрача натоўпу старыкоў, жанчын і дзяцей, раптам знізіўся нямецкі знішчальнік,* — пісаў 18 ліпеня ў артыкуле «Паднялася Беларусь» Янка Купала. — *На брэючым палёце фашысцкі вампір расстрэльваў з кулямётаў безабаронны натоўп і кінуўся уцякаць, як толькі на гарызонце паказаліся крыллі савецкіх «ястрабкоў...»*

*А натоўп беларускіх сялян астаўся ляжаць на дарозе. Па сівых барадах старыкоў паўзлі густыя патокі крыві. Мёртвыя мацеры сціскалі ў сваіх руках мёртвых дзяцей.*

*Труслівыя забойцы! Яны бамбяць безабаронныя сёлы і мястэчкі!*

*Яны грабяць, насілуюць нашых жанчын, як скаціну, рэжуць людзей.*

*Ці трэба гаварыць аб тым, чаму падымаецца беларускі народ на захватчыкаў?*

*...На што ж мяняць нам свабоду? На плецы і шыбеніцы фашыцкіх палачоў? На лёс рабоў?*

*...У занятых ворагам раёнах стварающца партызанскія атрады — конныя і пешыя. «Вока — за вока, зуб — за зуб» — адказам мы фашыстам, не дадзім ні адпачынку, ні тэрміну. Паляцяць у паветра масты, склады і абозы. Любоўць у Беларусі званых гасцей і не любяць нязваных. Пакуль будзе жыць хоць адзін беларус, не будзе на беларускай зямлі спакою фашысцкім захватчыкам, горкае будзе іх жыццё — з кожнага дрэва, з кожнага аўрага будуць сачыць за ім пільныя партызанскія вочы...»*


ЗВЯЗДА


Каб разбіць і знішчыць людаедаў, каб заліць іх сталлю і свінцом,—
У тылу працуй ты геройчна, будзь, таварыш, прыкладным байцом!

У ВАРОЖЫМ ТЫЛУ

По старонках «Звязды» можна бачыць, як зараджаўся партызанскі рух. У некаторых артыкулах апісваюцца трагедыі асобных людзей ці населеных пунктаў. Пасля здзекаў і катаванняў родных і знаёмых людзі самі сыходзілі ў лясы. Так, адзін з артыкулаў пачынаецца з распаведу, як пастух прынёс сваім аднавяскоўцам, якія былі на сенакосе, весткі, што ў вёсцы пачаў лютаваць вораг. Уначы мужчыны голымі рукамі перабілі фашыстаў, захапілі зброю.

1 жніўня газета пісала, што *«партызанскія атрады, узброеныя здабытымі ў ворага вінтоўкамі, кулямётамі, часам гранатамі і танкамі, якія водзяць былыя трактарысты, не толькі знішчаюць пераправы, разбіваюць абозы, падпальваюць базы і склады, але ў адважных схватках нечаканым нападам разбіваюць вялікія вайсковыя часці ворага».*

Як бачыце, ужо ў першыя месяцы вайны стыхійна ўзнікшы на Беларусі атрады становяцца грознай ваеннай сілай, з якой вораг пачынае лічыцца. Так, 10 жніўня «Звязда» пісала: *«Падраздзяленням германскай арміі забаронена цяпер аставацца на начлег у населеных пунктах. Раней, чым разбіць біваک у лесе, немцы доўга абстрэльваюць яго ўзлессе з кулямётаў. Партызаны мярэшчацца ім за кожным кустом! Адзін з афіцэраў скардзіцца ў пісьме дамоў: «Страшна ў Расіі, тут б'е кожны».*

*Немцы сур'ёзна занепакоены памерамі партызанскага руху ў Беларусі. Белагвардзейскі дыктар з Варшавы, які за грашы абслугоўвае ведамства Гебельса, надрываючыся да хрыпоты, па радыё пагражае беларусам спальваннем кожнай вёскі, дзе будзе знойдзены партызан. Але, не хістаючыся ні мінуты, усё новыя і новыя сотні сялян уходзяць у лясы, далучаючыся да партызанскіх атрадаў».*

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
22 ЧЭРВЕНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№12 (15819)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Ванеса КАЛАДЗІНСКАЯ:

# «Ад Алімпіяды цяпер хочацца большага»



**Спартыўных поспехаў яна пачала дасягаць рана. У 2012-м, калі Ванесе было ўсяго 19, трапіла на сваю першую Алімпіяду, потым стала чэмпіёнкай свету па вольнай барацьбе, але не пабаялася пакінуць спорт, каб нарадзіць дзіця. Праблемы са здароўем, якія паставілі пад пагрозу яе спартыўную кар'еру, узніклі пасля вяртання на барцоўскі дыван, але і з імі дзяўчына справілася. Сёлета ў маі спартсменка дадала да ўжо наяўных званняў перамогу на чэмпіянаце Еўропы. У інтэрв'ю Ванеса расказвала, дзеля чаго кожны дзень пераадольвае цяжкасці і ці складана выхоўваць дзіця ў рэжыме нон-стоп.**

***— Давайце пачнем з вашага імя, досыць рэдкага для Беларусі...***

— Яго далі мне бацькі, яны ў мяне трэнеры па спартыўнай гімнастыцы. Тата быў на зборах у Бельгіі, у той камандзе была дзяўчынка Ванеса. Яму спадабалася гэтае імя, калі прыехаў дадому, расказаў маме. Ёй яно таксама прыйшлося даспадобы, так і вырашылі мяне назваць. Чытала недзе, што «ванеса» — гэта від матылька, нейкага больш канкрэтнага значэння я не знайшла.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Педсавет

# ЗДО́РАВА, КАЛІ ВУЧАНЬ ЗДАРО́ВЫ

## Як зрабіць фізкультуру любімым урокам у школьнікаў?

**Ад чаго залежыць здароўе сучаснага школьніка? Можа, ад рацыянальнага распарадку дня? Ад рухальнага рэжыму дзіцяці і збалансаванага харчавання? У рэшце рэшт, ад эфектыўнасці школьных урокаў фізічнай культуры? Спецыялісты сцвярджаюць, што ад усіх гэтых фактараў разам узятых плюс ад псіхалагічнай атмасферы ў школе і ў сям'і. Днямі на базе 32-й сталічнай школы прайшла калегія трох міністэрстваў — адукацыі, аховы здароўя, спорту і турызму. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў аказаліся пытанні стварэння здароўезберагальнага асяроддзя ва ўстановах адукацыі і развіцця фізічнай культуры.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



«Лапта» — адна з дзевяці народных гульняў, уключаных у праграму спартыўна-адукацыйнага праекта БДПУ «Беларусіяда».

Свая стыхія

# ХТО ЎМЕЕ КІРАВАЦЬ ГУКАМ,

## ЦІ ШТО МЫ ЧУЕМ, АЛЕ НЕ БАЧЫМ

**...Каля сямі гадзін вечара ў пятніцу мы з Насцяй падыходзім да аднаго з невялікіх мінскіх рок-клубаў. Некалькі чалавек ужо стаяць каля ўвахода, але іх яшчэ не пускаюць: канцэрт пачнецца толькі ў восем. У зале пуста, толькі пара музыкантаў выносяць на сцэну інструменты і рыхтуюцца афіцыянты — з імі Насця хутка вітаецца, а потым мы збочваем у пакойчык насупраць сцэны. Гэта невялікая, літаральна два на два метры, каморка, дзе стаіць велізарны пульт з сотняй «круцёлак» і «рухалак» — працоўнае месца гукарэжысёра.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сёлета 24-гадовая чацвёртакурсніца Анастасія Казакова заканчвае Акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці «гукарэжысура», а цяпер актыўна набіраецца вопыту. Канцэртную сферу яна выбрала сама: з яе профілем можна працаваць як у філармоніі ці тэатры, так і ў кінаіндустрыі, на тэлебачанні, радыё ці нават дома «зводзіць» гук у песнях музычных гуртоў або ў саўндтрэках камп'ютарных гульняў.

— Нас вучаць усяму патроху: гукарэжысёру трэба быць універсалам, — расказвае Насця. — Але тут ёсць свае нюансы: калі ты працуеш на канцэртах доўгі час, то ў цябе паступова садзіцца слых, і потым у студыйных запісах ты ўжо проста не пачуеш некаторыя нюансы. А з іншага боку, калі ўвесь час сядзіш у студыі, то потым на канцэртах будзе цяжка працаваць з-за шуму... Хоць пагаршэнне слыху ўсё роўна непазбежнае: гэта наша прафесійная хвароба. Зараз я выбрала менавіта канцэрты, бо хацелася «дзвіжухі»: розныя гурты, жанры, апаратура, людзі, сітуацыі. Але я б з задавальненнем папрацавала і з арганам, і з сімфанічным аркестрам ці, напрыклад, хорам.

Канцэрт яшчэ не пачаўся, і ў Насці ёсць час расказаць мне, што на мове прафесіяналаў «круцёлкі» на пульце — гэта патэнцыёметры, а «рухалкі» — фэйдары. Сам жа пульт называецца FOH, ад англійскага «front of house» — гэта значыць, што з яго «круціцца» той гук, які будуць чуць у зале.

— Бывае яшчэ і маніторны пульт, але ў невялікіх залах няма сэнсу ім карыстацца, — кажа дзяўчына. — Ён звычайна стаіць за кулісамі і робіць мікс для музыкантаў. Бачыла на сцэне такія нізкія шырокія калонкі, павернутыя да выступоўцаў? Яны патрэбны, каб музыканты добра чулі самі сябе.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Факт*

## Магістраў медыцынскай фізікі падрыхтуюць у БДУ

**Новая спецыяльнасць «медыцынская фізіка» адкрываецца ў магістратуры Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава БДУ.**

Яе адкрыццё абумоўлена ростам патрэбы ў спецыялістах з паглыбленым веданнем сучаснага медыцынскага абсталявання, у прыватнасці тэхнікі для прамянёвай тэрапіі раку. Падрыхтоўка магістраў па спецыяльнасці «медыцынская фізіка» дазволіць папоўніць недахоп кадраў, здольных адказваць за бяспечную эксплуатацыю складанага медыцынскага абсталявання ў анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Гаворка ідзе пра якаснае выкарыстанне рэнтгенаўскіх, магнітна-рэзанансных, эмісійных камп'ютарных тамографаў, апаратуры для разліку спажытых доз і дазіметрычнага кантролю і г. д.

У адрозненне ад інжынераў выпускнікі новай магістарскай праграмы будуць не толькі абслугоўваць абсталяванне, але і разам з урачамі ўздзейнічаць на захворванне. Напрыклад, пры прамянёвай тэрапіі яны павінны з высокай дакладнасцю накіраваць на пухліну дозу лячэбнай радыяцыі. Гэта патрабуе вывераных разлікаў і дакладнай настройкі абсталявання.

Паводле папярэдніх ацэнак, патрэба ў такіх кадрах да 2020 года ў Беларусі складзе больш як 400 спецыялістаў, з якіх каля сотні павінны мець дыплом магістра.

Магістры медыцынскай фізікі змогуць прэтэндаваць на пасады начальнікаў аддзелаў і лабараторый, кваліфікаваных экспертаў, якія адказваюць за распрацоўку і выкананне праграм бяспечнага выкарыстання крыніц іанізуючага выпрамянення ў медыцыне.

Сёння ў магістратуры БДУ навучаецца больш як 1300 чалавек па 88 спецыяльнасцях. Прыём дакументаў на ўсе спецыяльнасці магістратуры будзе ажыццяўляцца з 27 чэрвеня па 5 ліпеня.

*Не вучобай адзінай!*

## Педагогі асвойваюць... бізнес

**Фірменная крама «Каларыт» адкрылася ў галоўным корпусе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта.**

Ідэю арганізацыі ўніверсітэцкай крамы рэктар БДПУ Аляксандр Жук выказаў яшчэ ў пачатку года. З таго часу ва ўніверсітэце закіпела работа: спачатку праект быў ажыццёўлены ў 3D-фармаце. Улічваліся многія аспекты: псіхалогія ўспрымання колеру, патрабаванні да заніравання гандлёвай залы, выкладкі тавараў і іншыя.

— У вялікім асартыменце ў нас прадстаўлены найноўшыя распрацоўкі выкладчыкаў універсітэта, выдадзеныя вучэбна-выдавецкім цэнтрам БДПУ: падручнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, практыкумы, — падкрэслівае начальнік цэнтра Пётр Савасцёнак.

Акрамя таго, крама галоўнай педагагічнай ВНУ краіны прапануе шырокі спектр сувенірнай прадукцыі БДПУ з сімволікай універсітэта, а таксама канцылярскія тавары паўсядзённага попыту: сшыткі, нататнікі, ручкі, гумкі, календары. Пры жаданні тут можна набыць прадукцыю для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту — на гэту катэгорыю пакупнікоў разлічана асобная зона.

Адметнасцю «Каларыту» з'яўляецца яго шматфункцыянальнасць. Акрамя згаданых тавараў, тут прапануюцца паслугі па друку з электронных носьбітаў, ксеракопія, ламінаванне, пераплёт, а таксама тэрміновы выраб фатаграфій і перанос малюнкаў на майкі і кубкі. Адным словам, усе тыя паслугі, якія аказваюць сучасныя цэнтры друку.

Ва ўніверсітэце не сумняваюцца: «Каларыт» будзе запатрабаваны студэнтамі, педагогамі і проста зацікаўленымі пакупнікамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ЗДО́РАВА, КАЛІ ВУЧАНЬ ЗДАРО́ВЫ

## ЦЯЖАР РАНЦА

— Лад жыцця дзяцей апошнім часам зведаў значныя змены. Інтэнсіфікацыя працэсу навучання, дэфіцыт часу для засваення інфармацыі ў спалучэнні з памяншэннем працягласці сну, зніжэннем рухальнай актыўнасці аказваюць неспрыяльнае ўздзеянне на арганізм, які развіваецца, — падкрэсліла ў сваім выступленні **Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь, намеснік міністра аховы здароўя Наталля ЖУКАВА.** — Па выніках сацыялагічных даследаванняў, праведзеных навукоўцамі-гігіеністамі з медуніверсітэта, самая значная праблема для школьнікаў — неадпаведнасць рэжыму дня гігіенічным рэкамендацыям. Так, у паловы дзяцей сон складае менш як восем гадзін у суткі. Каля 40 працэнтаў дзяцей у вольны ад вучобы час аддаюць перавагу камп'ютару або прагляду тэлевізара, пры гэтым кожны дзясяты праводзіць за экранам больш як чатыры гадзіны ў дзень. Амаль палова не бывае на адкрытым паветры штодня і толькі кожны чацвёрты займаецца фізічнымі практыкаваннямі рэгулярна.

Статыстычныя даныя сведчаць, што за гады навучання ў школе зніжаецца колькасць школьнікаў першай групы здароўя і павялічваецца колькасць прадстаўнікоў трэцяй групы. Уплыў унутрышкольнага асяроддзя на здароўе даволі істотны — да 20 працэнтаў. Да «школьных паталогій» адносяцца, напрыклад, парушэнні вастрыні зроку, паставы... Неспрыяльнае «ўнутрышкольнае асяроддзе» ўплывае і на адаптацыйны патэнцыял дзіцячага арганізма, зніжэнне яго функцыянальных рэзерваў... Колькасць навучэнцаў з напружаным адаптацыйным патэнцыялам у апошнія гады істотна павялічылася...

Медыкі звяртаюць увагу, што ёсць асобныя пытанні ў арганізацыі навучальнага працэсу, якія не патрабуюць матэрыяльных выдаткаў, але разам з тым аказваюць негатыўны ўплыў на стан здароўя дзяцей. Гэта невыкананне патрабаванняў да раскладу вучэбных заняткаў, графікаў правядзення кантрольных работ, працягласці перапынкаў, правядзенне фізкультурных заняткаў без уліку асноўнай вучэбнай нагрузкі, няправільнае рассаджванне за вучнёўскай мэбляй, адсутнасць у памяшканнях пачатковых класаў умоў для захоўвання прылад для ўрокаў працы, кніг і дапаможнікаў, спартыўнай формы, а таксама недастатковы кантроль за змесцівам школьных ранцаў. Нягледзячы на тое, што падручнікі істотна страцілі ў вазе, 50 працэнтаў школьных сумак усё роўна перавышаюць устаноўленыя нарматывы — за кошт прадметаў, якія там знаходзяцца, але не маюць дачынення да адукацыйнага працэсу.

## СМАЧНА ЕСЦІ!

— Харчаванне — галоўны фактар захавання здароўя дзяцей, — падкрэсліла Наталля Жукава. — І я кажу дзякуй педагагічным калектывам кожнай школы, якія на працягу доўгіх гадоў прывучалі бацькоў да таго, што гарачае харчаванне — вельмі важны складнік у фарміраванні арганізма і працаздольнасці школьнікаў. Сёння гарачым харчаваннем ахоплена ад 95 да 100 працэнтаў навучэнцаў. Але праблемным пакуль застаецца асартымент буфетнай прадукцыі. Кіраўнікам школ неабходна ўзяць яго пад свой асабісты кантроль, устаць на пазіцыі здаровага харчавання, зменшыць там прысутнасці кандытарскіх вырабаў, прысмакаў і іншай некарыснай ежы, — падкрэслівае Наталля Жукава. — Трэба мець на ўвазе, што каля 14% падлеткаў цярпяць ад атлусцення і да 30% маюць залішнюю вагу. З іншага боку, калі колькасць хлопчыкаў з залішняй вагой у старшых класах павялічваецца, то сярод дзяўчат у гэтым узросце да 10 працэнтаў маюць, наадварот, недастатковую вагу, а гэта будзе мець наступствы для іх рэпрадуктыўнага здароўя.

Спадзявацца толькі на школьныя заняткі фізічнай культурай бессэнсоўна: два ўрокі фізкультуры і гадзіна здароўя і спорту забяспечваюць толькі 20% патрэбы дзіцяці ў рухальнай актыўнасці на працягу тыдня, а штодзённая патрэба складае 60 хвілін рухальнай актыўнасці.



У маі сталічныя школьнікі паўдзельнічалі ў спартыўна-адукацыйным праекце «Беларусіяда»: на стадыёне БДПУ вызначалі самага хуткага, самага дужага, самага спрытнага і самага кемлівага ў... народных гульнях.

На дапамогу маглі б прыйсці агульнашкольныя дынамічныя перапынкі з удзелам навучэнцаў сярэдніх і старшых класаў у выглядзе танцаў і іншых формаў (накшталт флэшмобаў) з выкарыстаннем скакалак, «класікаў», «дарожак здароўя», дываноў у рэкрэацыі, правядзенне фізкультхвілінак, выкарыстанне афтальмалагічных трэнажораў не толькі для пачатковых класаў, але і для старэйшых навучэнцаў, прымяненне ў навучальным працэсе педагагічных здароўезберагальных тэхналогій (адначасовае выкарыстанне некалькіх класных дошак і іншае). Такія меры ўжо рэалізуюцца ў школах Астраўца, Маладзечна, Светлагорска, Мінска і інш. Але гэты вопыт трэба распаўсюдзіць на ўсе школы.

## УВАГА — РАСКЛАДУ

— Паколькі раўнапраўнымі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца педагогі, навучэнцы і іх бацькі, то і суб'ектамі стварэння здароўезберагальнага асяроддзя павінны быць усе вышэйпералічаныя катэгорыі. Толькі работа ў трох кірунках можа прынесці станоўчыя вынікі, — падзялілася сваімі думкамі **начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.** — Як тэатр пачынаецца з вешалкі, так **арганізацыя адукацыйнага працэсу ў школе пачынаецца з раскладу вучэбных заняткаў.** Агучу некаторыя вынікі маніторынгу, падчас якога вывучаўся ўзровень стомленасці і разумовай працаздольнасці вучняў VIII класа, а таксама фактары, якія аказваюць уплыў на стан здароўя навучэнцаў.

У ходзе даследавання стомленасць рознай ступені была выяўлена ў 77% васьмікласнікаў. 17% навучэнцаў адзначылі, што складаныя прадметы (матэматыка, фізіка, хімія і іншыя) заўсёды праводзяцца на першым і (або) апошнім уроку, яшчэ 70% адзначылі, што такое адбываецца час ад часу. У 10% выпадкаў кантрольныя работы праводзяцца на першым уроку і амаль у 7% — на апошнім уроку. Больш як 45% васьмікласнікаў канстатавалі, што час ад часу ў адзін дзень у іх праводзяцца кантрольныя работы адразу па некалькіх вучэбных прадметах.

— Калі ўлічыць, што на першым і апошнім уроках у вучняў зніжана інтэлектуальная прадукцыйнасць, замаруджаны разумовыя працэсы, то ўзнікае пытанне: які вынік навучання хоча ўбачыць на апошнім уроку, напрыклад, па матэматыцы намеснік дырэктара, які ставіць гэты ўрок апошнім на працягу некалькіх дзён, і настаўнік, які плануе кантрольную работу менавіта ў той дзень, калі яго ўрок апошні або першы ў раскладзе? — задае зусім не рытарычнае пытанне Святлана Уклейка. — На жаль, але стварэнне здароўезберагальнага асяроддзя ва ўстановах адукацыі не стала пакуль клопатам усіх без выключэння педагагічных работнікаў — ад дырэктара да настаўніка.

Пры гэтым і бацькі цалкам адэкватна ацэньваюць прычыны стомленасці сваіх дзяцей, згадваючы сярод іх невыкананне рэжыму дня, недастатковы час для сну, працяглае знаходжанне за камп'ютарам, а таксама дадатковую нагрузку — наведванне розных заняткаў, гурткоў, секцый і г. д.

## ПАМЫЛКА ЯК ПРЫСУД!

Другі важны кампанент здароўезберагальнага асяроддзя з пазіцыі вучня — гэта **спрыяльны псіхалагічны клімат,** або стварэнне сітуацыі поспеху. Вядома, што эмоцыі ўплываюць на працэсы ўспрымання, памяці, мыслення, могуць альбо актывізаваць, альбо тармазіць іх. Негатыўныя эмоцыі, страхі блакіруюць не толькі мысленне, але і правакуюць няўпэўненасць, нізкую самаацэнку, моцнае нервовае напружанне, якое ў выніку прыводзіць да стамлення. Страх дапусціць памылку тармозіць уменне разважаць і шукаць розныя варыянты вырашэння праблемы. Як правіла, страх дапусціць памылку з'яўляецца следствам жорсткіх, аўтарытарных адносін паміж настаўнікам і вучнямі.

У ходзе маніторынгу амаль 40% навучэнцаў з прыкметамі стомленасці адзначылі, што яны адчуваюць боязь памыліцца і выглядаць смешнымі ў вачах аднакласнікаў і (або) настаўнікаў. Каля трэціны вучняў адчуваюць сябе некамфортна на вучэбных занятках з-за страху перад настаўнікам.

Трэці кампанент, важны для навучэнца, — гэта **выкарыстанне настаўнікам здароўезберагальных тэхналогій.** Прыкладна 40% васьмікласнікаў упэўнены, што прычынай іх хуткай стомленасці з'яўляецца запісванне вялікага аб'ёму вучэбнай інфармацыі на ўроку. Кожны чацвёрты навучэнец адзначыў, што хутка стамляецца ад таго, што настаўнік патрабуе ад вучняў дакладна перадаць тэкст параграфа, кожны дзясяты — ад аднастайнай і манатоннай дзейнасці на ўроку. Больш як 20% навучэнцаў прычынай стомленасці лічаць гучную гаворку настаўніка...

## ВЫХАВАННЕ... НАСТАЎНІКА

Асобна ўдзельнікі калегіі спыніліся на эфектыўнасці ўрокаў фізічнай культуры ў школах. Як зрабіць іх больш прывабнымі для дзятвы?

— Вельмі шмат залежыць ад асобы настаўніка, — упэўнены **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** — Мне ў школьныя гады пашанцавала з неабыякавым педагогам, які павёў нас за сабой, захапіў гульнявымі відамі спорту. Мы гулялі ў «Арлёнак» і «Зарніцу», здавалі спартыўныя нарматывы, увесь вольны час праводзілі не дома, а ў спартыўнай зале. Таму проста абуральна назіраць, як у некаторых настаўнікаў вучні на ўроку фізкультуры бязмэтна сноўдаюцца па стадыёне. А частка вучняў, якія маюць медыцынскія абмежаванні да заняткаў фізкультурай, увогуле проста сядзяць на лаўцы. Няўжо іх няма чым заняць?

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры Сяргей РЭПКІН** расказаў, што вучэбны працэс у іх ВНУ арганізаваны так, што практычнае навучанне пераважае. Студэнты ўжо з першых курсаў накіроўваюцца ў школы, дзе вядуць валанцёрскую работу, арганізоўваюць спартыўныя мерапрыемствы, наладжваюць цесныя сувязі з педагогамі школ і навучэнцамі, што дазваляе ім паспяхова адаптавацца ў педагагічным асяроддзі.

**Згодна з вынікамі даследаванняў БДМУ**

**97,7% школьнікаў маюць персанальны камп'ютар;**

**56,6% навучэнцаў праседжваюць каля камп'ютара ад 1 да 3 гадзін, 23,8% — ад 3 да 5 гадзін.**

**Пры гэтым на заняткі вучобай за камп'ютарам траціцца мінімальны час. 60% часу карыстання камп'ютарам у хлопчыкаў займаюць гульні, а дзяўчаты 50% часу праводзяць у сацыяльных сетках.**

Сяргей Рэпкін прапанаваў перавесці гадзіну здароўя і спорту ў ранг звычайнага ўрока, спасылаючыся на сусветную практыку. Паводле яго слоў, **у большасці замежных краін урокі фізічнай культуры праводзяцца не радзей чым тры разы на тыдзень, прычым найбольшая колькасць гадзін прыпадае на малодшы школьны ўзрост** — найбольш спрыяльны для фарміравання навыкаў і развіцця фізічных здольнасцяў. Ён паведаміў, што ў школьных праграмах розных краін пастаянна павялічваецца аб'ём выкладання спартыўных дысцыплін і відаў спорту. Назіраецца тэндэнцыя стварэння дастаткова гнуткіх школьных праграм фізічнага выхавання, якія дазваляюць настаўніку самастойна змяняць змест навучання ў залежнасці ад узросту і полу выхаванцаў, кліматычных умоў і матэрыяльнага становішча, нацыянальных каштоўнасцяў і традыцый.

Хацелася б, падкрэсліў рэктар, каб у прафесійныя кампетэнцыі настаўніка фізкультуры былі ўключаны ўменні і навыкі, звязаныя з дыягностыкай спартыўных схільнасцяў навучэнцаў для іх адбору ў спецыялізаваныя класы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Ідэі маладых

# І чуць, і спяваць — са смартфонам

## Як у лабараторыі БДУІР ствараюць інавацыйны «софт»

**Маеце праблемы са слыхам? Марыце прыгожа спяваць, але прырода не ўзнагародзіла вакальнымі данымі? У XXI стагоддзі гэта не праблема — дапамагчы практычна ў любой справе можа камп'ютар ці смартфон. Праграмы для вырашэння самых розных задач распрацоўваюць і маладыя айчынныя навукоўцы, якія шчыруюць у лабараторыі «Мульціпрацэсарныя сістэмы рэальнага часу» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» завіталі ў БДУІР і бліжэй пазнаёміліся з самымі цікавымі праектамі.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Дацэнт кафедры электронных вылічальных сродкаў Максім Вашкевіч *(справа)* і яго калега Мікалай Пятроўскі могуць абмяркоўваць новыя ідэі днямі напралёт.**

— Адна з дастаткова распаўсюджаных праблем са здароўем, з якой сутыкаюцца многія, у тым ліку і моладзь, — аслабленне слыху, — расказвае **дацэнт кафедры электронных вылічальных сродкаў Максім ВАШКЕВІЧ**. — Прычыны на тое розныя, напрыклад, пастаяннае праслухоўванне музыкі ў навушніках пры высокай гучнасці. Многія не ўсведамляюць праблему, таму і не звяртаюцца па медыцынскую дапамогу. Мы вырашылі задзейнічаць для паляпшэння слыху смартфон, каб карыстальнік мог без лішніх выдаткаў хаця б на першы час палепшыць слых.

Вынікам работы стала мабільная праграма для Android і iOS пад назвай Petralex. Пры першым запуску яна правярае слых карыстальніка (трэба толькі ўставіць навушнікі і прайсці хуткі тэст), пасля чаго прапаноўвае пэўны ўзровень узмацнення. Можна выбіраць розныя рэжымы, напрыклад «На вуліцы» ці «Дома». Гэта дазваляе людзям з паслабленым слыхам не набываць дарагія слыхавыя апараты.

— Вядома, мы не бяром на сябе функцыі медыкаў, — сцвярджае Максім Вашкевіч. — Праграма не можа ставіць дыягназ і тым больш лячыць захворванні. Але яна істотна дапамагае. Неяк дэманстравалі яе на адной з выставак, і наведвальніца, якая пратэсціравала распрацоўку, сказала, што ўражанні аналагічныя тым, якія адчувае чалавек са слабым зрокам пры першай прымерцы акуляраў. Праграма абсалютная бясплатная, рэкламы ў ёй таксама няма.

У далейшых планах распрацоўшчыкаў Petralex — другое пакаленне праграмы. Яна пашырыць функцыянальнасць, напрыклад, з'явіцца магчымасць падаўлення шуму, а тэсціраванне слыху стане больш дакладным.

Яшчэ адна распрацоўка лабараторыі таксама звязана з гукам — гэта праграма SingAssist, якая пакуль не выпушчана для карыстальнікаў. У лабараторыі яе жартам характарызуюць так: «Спяваю як магу, а на выхадзе — «зорка». І гэта найлепшае апісанне задумы. Алгарытм умее распазнаваць хібы ў выкананні песень і выпраўляць іх: дзесьці павышаць ці паніжаць асноўны тон, запавольваць ці паскараць вымаўленне. Фактычна на выхадзе чалавек з мікрафонам атрымлівае ідэальнае выкананне абсалютна любой песні. Прызначэнне праграмы пераважна забаўляльнае — спяваць у караоке з дапамогай камп'ютара стане значна больш прыемна. Але стваральнікі спадзяюцца, што распрацаваныя алгарытмы дапамогуць і прафесійным выканаўцам.

**Дацэнт кафедры электронных вылічальных сродкаў Ілья АЗАРАЎ** дэманструе нам прэзентацыю, у якой прадстаўлены магчымасці будучай праграмы. Наўмысна няўдала напеты на мікрафон «Чорны крумкач» (прыкладна такой жа якасці выкананне ў большасці аматараў спяваць у караоке) імгненна набывае значна лепшае гучанне.

У лабараторыі «Мультыпрацэсарныя сістэмы рэальнага часу» займаюцца самымі рознымі праектамі. Яшчэ адзін актуальны кірунак — сістэмы сінтэзу маўлення па друкаваным тэксце. Многім вядома, як папулярныя сэрвісы накшталт Google дазваляюць увесці ў праграму любы тэкст, а той яго агучыць. У лабараторыі пайшлі далей: іх алгарытм умее «размаўляць» абсалютна любым галасам. Дастаткова ўсяго сказаць на мікрафон некалькі слоў, і праграма яго «кланіруе» — камп'ютар загаворыць тэмбрам дыктара.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

Летнія перспектывы

# Працоўны дэсант... у «Вікіпедыю»

**Дваццаць тры студэнцкія атрады сфарміраваныя Штабам працоўных спраў БРСМ БДУ. Трынаццаць з іх будуць аказваць сэрвісныя паслугі, шэсць — педагагічныя, а чатыры зоймуцца сельскагаспадарчымі відамі работ.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Больш за 300 студэнтаў універсітэта ўжо прыступілі да работы. Маладыя людзі працуюць у вучэбна-доследным рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Шчомысліца» БДУ, у спартыўна-аздараўленчым комплексе БДУ «Брыганціна», дзіцячым аздараўленчым лагеры «Гарызонт», а таксама ў сацыяльным цэнтры для дзяцей-інвалідаў «Парастак».

У ліпені юнакі і дзяўчаты зоймуцца добраўпарадкаваннем і падрыхтоўкай студэнцкіх інтэрнатаў да новага навучальнага года. Таксама ў перыяд прыёмнай кампаніі студэнты БДУ будуць прыцягвацца для арганізацыі працы грамадскай камісіі.

У жніўні студатрады накіруюцца ў Мінскае раённае унітарнае прадпрыемства «Аграмкамбінат «Ждановічы» для збору ўраджаю.

Яшчэ адзін зусім новы фронт работ — Фундаментальная бібліятэка БДУ, дзе будуць у жніўні працаваць каля 50 чалавек. Задача хлопцаў і дзяўчат — папаўняць і абнаўляць даныя прафесарска-выкладчыцкага саставу БДУ ў інтэрнэт-энцыклапедыі «Вікіпедыя». Не сакрэт, што адным з крытэрыяў, які бярэцца пад увагу ў міжнародных рэйтынгах універсітэтаў, з'яўляецца «бачнасць» ВНУ ў інтэрнэт-прасторы.

Працоўны семестр у БДУ, як правіла, доўжыцца да канца жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

На выклік часу

# Да бежанцаў — талерантна

**Падведзены вынікі конкурсу творчых работ «Бежанцы: твой дом — мая крэпасць». Спаборніцтвы праходзілі ў дзвюх намінацыях: «Найлепшы плакат/фотаработа» і «Найлепшы відэаролік».**

Самым лепшым стаў відэаролік, зняты курсантам Інстытута пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь Віктарам Стэлькіным. Работа пяцікурсніцы факультэта міжнародных адносін (ФМА) БДУ Антаніны Марозавай заняла ў гэтай намінацыі другое месца. А трэцюю пазіцыю падзялілі трэцякурснік ФМА Павел Лашук і творчая група ў саставе курсантаў Універсітэта грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Арцёма Мельнікава і Аляксандры Саўчук.

У намінацыі «Найлепшы плакат/фотаработа» пераможцам быў прызнаны плакат «Наш дом — Зямля» студэнткі факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Ганны Шчарбітавай. Прадстаўніца гэтай жа ўстановы студэнтка Анастасія Сцяпанчанка за серыю плакатаў «Свет. Адзінства. Роўнасць» і «Разам пад аховай» заняла другое месца. Замыкае тройку прызёраў студэнтка фармацэўтычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аліна Тычына са сваім плакатам «Працягні руку дапамогі».

Усяго ў гэтым годзе на конкурс было даслана 17 відэаролікаў і 36 плакатаў і фотаработ ад 39 студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў Беларусі.

Арганізатарамі конкурсу выступілі Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў і Міжнароднае грамадскае аб'яднанне па навукова-даследчых і інфармацыйна-адукацыйных праграмах «Развіццё». Мерапрыемства накіравана на прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем бежанцаў, садзейнічанне фарміраванню талерантнасці і паважлівага стаўлення да гэтай катэгорыі грамадзян.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Свой стыль

# ХОЧАМ? ДЫК «ЗРОБІМ»!

## І, галоўнае, самабытна

**Героі гэтага матэрыялу — Аляксей Караблёў і Андрусь Бездар — заснавальнікі архітэктурнай студыі «ZROBYM architects». Ужо пяць з паловай гадоў яны працуюць над цікавымі праектамі ў розных сферах творчасці. Галоўны напрамак дзейнасці хлопцаў — стварэнне праектаў дамоў і дызайн інтэр'ераў. Яшчэ яны маюць уласны мэблевы брэнд, удзельнічаюць у распрацоўцы энергаэфектыўнага жылля. Займаюцца і новым для Беларусі кірункам — модульным праектаваннем. Ужо рэалізавана мноства праектаў, а наперадзе планаў яшчэ больш.**


**Праект драўлянага дома ад студыі «Зробім».**

***— Што зараз вас цікавіць найбольш?***

**Андрусь:** — У мяне ёсць праект вулічнага адзення, — рэчы, якія можна апранаць штодня. Не ўпэўнены, ці можна ўсё гэта назваць калекцыяй, бо я не ведаю, колькі ў ёй павінна быць адзінак. Але ўжо створаны каталог, ёсць чатыры крамы, дзе адзенне прадаецца.

**Аляксей:** — Таксама мы цяпер праектуем сваю кавярню.

**Андрусь:** — Пакуль гэта толькі ідэя: адкрыць менавіта архітэктурную кавярню, бо такой тэматычнай установы ў нас няма. Плануем, што гэта будзе вялікае памяшканне ў цэнтры Мінска. Там можна будзе чытаць лекцыі па архітэктуры з удзелам нашых калег і студэнтаў. Усе сакрэты праекта раскрываць не буду...

Ёсць таксама ідэя стварыць цэнтр модульных дамоў. Для яе рэалізацыі знайшліся інвестары, месца ў Мінску. Але мы вырашылі рабіць гэта за горадам. Практыка паказала, што больш зручна і проста для кліента набыць дом адразу з надзелам зямлі. Таму шукаем некалькі такіх, якія б знаходзіліся побач адзін ад аднаго, у раёне 30 кіламетраў ад Мінска. На кожным думаем пабудаваць дом. Атрымаецца такі экспазіцыйны цэнтр, куды можна прыехаць, убачыць ужо гатовыя дамы, «памацаць» іх. І калі спадабаецца, набыць упадабаны і жыць побач з суседзямі, якія зрабілі аналагічны выбар.

Акрамя гэтага, мы плённа працуем і над сваім мэблевым брэндам. Цікавыя і аднačасова простыя мадэлі ўжо ўпрыгожваюць не адзін інтэр'ер.

***— Чаму ўзяліся яшчэ і за вытворчасць мэблі?***

**Андрусь:** — Хочацца камплектаваць інтэр'еры цалкам з беларускіх тавараў. Цікавых майстроў у гэтай сферы ў нас вельмі мала. Таму мы адчулі, што можна самім паспрабаваць серыйна рабіць мэблю. І ў нас атрымалася.

***— Кожная ваша работа мае адсылку да нашых каранёў...***

**Андрусь:** — Так, адзенне абавязкова з цікавым самабытным прынтам: саламяны конь ці певень, знакавы беларускі гістарычны дзеяч, малюнак роднага мястэчка. На прадметах мэблі красуецца лагатып «BY» — адразу разумееш, дзе рэч была зроблена. У архітэктурнай дзейнасці (праекты дамоў, інтэр'еры) таксама выкарыстоўваецца падыход, блізкі нашым прадкам: натуральныя матэрыялы, нічога лішняга, усё проста і функцыянальна.

**Аляксей:** — Гэта, мабыць, свайго роду самавызначэнне. Мы прывязаны да таго месца, дзе праектуем, адсюль і такі стыль у работах. Зараз у свеце наогул у трэндзе самабытнасць.

...Слухаючы, з якой цікавасцю хлопцы расказвалі пра сваю справу, пра праекты, я зрабіла простую выснову: шчаслівы той чалавек, які займаецца той справай, што знаходзіць водгук у сэрцах іншых.

**Дар'я АРЭФ'ЕВА,**
**студэнтка VI курса Інстытута журналістыкі БДУ.**


**Андрусь у футболцы асабістай вытворчасці.**

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

## БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ — НЕ ЦЯЖКА!

**Каля ста спартыўных мерапрыемстваў для так званых цяжкіх падлеткаў праводзе БРСМ у Гродзенскай вобласці падчас летняй акцыі «Твой крок насустрач здароўю», паведамілі ў абласным камітэце маладзёжнай арганізацыі.**

Мэта праекта — далучыць падлеткаў, якія стаяць на розных відах уліку, да здаровага ладу жыцця, а таксама прадставіць ім альтэрнатыўныя варыянты правядзення вольнага часу. Масавыя спартыўныя мерапрыемствы праекта пройдуць у час канікул у кожным раёне Гродзенскай вобласці. Сярод іх будуць спаборніцтвы па незвычайных відах спорту, квэсты і эстафеты, камандныя гульні. Напрыклад, у Воранаўскім і Дзятлаўскім раёнах згуляюць у міні-футбол, у Свіслачы хлопцаў і дзяўчат запросяць на актыўную квэст-гульню, у Зэльвенскім раёне прапануюць пераадолець жартаўлівыя «Вясёлыя старты», а ў Іўеўскім раёне вырашылі апрабаваць страйкбол. У спартыўнай праграме праекта таксама стрытбол, папулярныя ў моладзі баскетбол і валейбол, іншыя спартыўныя мерапрыемствы. Магчыма, праект падоўжаць і на час школьных канікул да канца года. Чакаецца, што пастаяннымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў стануць каля 900 цяжкіх падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў ва ўсіх раёнах вобласці.

## У РЭЙД ВЫХОДЗІЦЬ «ЛЕТНІ ПАТРУЛЬ»

**Да канца лета будзе праходзіць традыцыйная сумесная акцыя Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Летні патруль».**

Падчас яе работнікі падраздзяленняў МНС разам з удзельнікамі маладзёжных атрадаў аховы правапарадку (МААП) правядуць ва ўсіх рэгіёнах краіны мерапрыемствы, скіраваныя на прафілактыку і папярэджанне ўзнікнення пажараў, гібелі ад іх людзей, няшчасных выпадкаў на вадзе. У прыватнасці, з мэтай выяўлення парушэнняў правілаў пажарнай бяспекі і ачагоў узгарання ў летні перыяд будуць арганізаваны рэйды ў лясы і на тарфянікі, а з мэтай прадухілення гібелі грамадзян на вадзе — патруляванне ў афіцыйна ўстаноўленых месцах для купання і адпачынку грамадзян каля берагавой лініі вадаёмаў.

Арганізатары праекта ўпэўненыя, што акцыя «Летні патруль» будзе спрыяць павышэнню ўзроўню культуры бяспекі жыццядзейнасці сярод усіх узроставых груп насельніцтва, у першую чаргу — дзяцей і моладзі, скарачэнню колькасці пажараў і няшчасных выпадкаў на вадзе, у тым ліку пры эксплуатацыі воднага транспарту.

Нагадаем, што ў краіне створаны 132 МААП па ўзаемадзеянні з органамі і падраздзяленнямі па надзвычайных сітуацыях агульнай колькасцю 1,6 тысячы чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Калі галоўнае — у дробязях*

# ТАНЧЭЙ ЗА ВОЛАС,

## або Навошта лабаранту вострыя зрок

**Хоць нафту звычайна называюць энерганосьбітам, з яе робяць далёка не толькі паліва. Акрамя бензіну, газы, мазуту і саляркі, прадуктамі яе перапрацоўкі становяцца ўгнаенні, поліэтылен, пластмаса, каўчук, а таксама сінтэтычнае валакно. Апошняга існуюць дзясяткі відаў: нейлон, лайкра, поліэстэр... Сярод найбольш распаўсюджаных — акрылавыя валокны, у прыватнасці, створаны яшчэ ў СССР «Нітрон-Д». У Беларусі яго выпускаюць на прадпрыемстве «Палімір», што ў Наваполацку. Адна з маладых супрацоўніц, якая ведае ці не ўсё пра вытворчасць тканіны з «чорнага золата», — супрацоўніца лабараторыі па кантролі вытворчасці сінтэтычнага валакна Алена АНІСІМАВА.**


Фота Надзеі БУЖАН.

На прадметным шкле — тонкія валокны «Нітрона-Д».

— Жаданне працаваць у хімічнай прамысловасці з'явілася ў мяне дзякуючы бацьку, — успамінае дзяўчына. — Ён дваццаць гадоў адпрацаваў зусім побач, на «Нафтане» камандзірам аддзялення пажарна-ратавальнай часці, хоць жылі мы досыць далёка — у пасёлку Асвея Верхнядзвінскага раёна. Вядома, у дзяцінстве неаднойчы даводзілася прыязджаць сюды, і мяне заўжды вельмі цікавіла, што тут вырабляюць, як гэта робіцца, якія людзі працуюць. Вось гэта цікаўнасць і дапамагла зрабіць выбар — вырашыла, што буду працаваць у нафтахіміі. Пасля школы паступіла ў Наваполацкі дзяржаўны політэхнічны каледж на спецыяльнасць «перапрацоўка нафты і газу», ужо на трэцім курсе ўпершыню прыйшла практыкавацца на «Палімір» у лабараторыю фізіка-механічных выпрабаванняў валакна. Такі ж шлях чакаў і большасць маіх аднакурснікаў: нехта трапіў на вытворчасць поліэтылену, хтосьці — на сінтэз манамераў, іншыя — у лабараторыі ўваходнага кантролю.

Суразмоўніца адзначае, што найбольшае ўражанне яшчэ ў час практыкі на яе аказаў калектыў — з усімі было лёгка працаваць і мець зносіны. Таму хацела вярнуцца менавіта сюды, і яе мара спраўдзілася.

Усяго ў лабараторыі тры напрамкі: фізіка-механічных выпрабаванняў, дзе праводзяць аналізы партый гатовай прадукцыі, фарбавання, а таксама хімічны.

— Па выніках даследаванняў мы рэкамендуем прысвоіць валакну пэўную сортнасць, — расказвае Алена. — Яна можа быць першай, другой або трэцяй, усё залежыць ад дасканаласці тэхналагічнай лініі. Вядома, найбольшы аб'ём прадукцыі мае найвышэйшую якасць. Канчатковa сортнасць прысвойваюць кантралёры аддзела тэхнічнага кантролю, менавіта яны ставяць адзнаку ў пашпарце якасці гатовай партыі.

Калегі называюць Алену «універсальным салдатам» — дзяўчына з лёгкасцю выконвае не толькі фізіка-механічныя выпрабаванні, але пры патрэбе падмяняе сваіх калег з іншых падраздзяленняў. Многіх, пэўна, найбольш уразіла б работа лабараторыі фарбавання, дзе супрацоўніцы пры дапамозе спецыяльнай светлавой шафы аналізуюць каляровае валакно. «Нітрон-Д» можна пафарбаваць у сотні самых розных колераў, толькі летась на прадпрыемстве было створана 166 новых рэцэптур (частка з іх мае «аўтарства» Алены). Вядома, працаваць тут можа далёка не кожны — «адчуваць» колеры лабаранту трэба проста ідэальна. Нават дробнае несупадзенне адцення валакна з заяўленым адпраўляе яго ў брак, тое самае датычыцца і любой неаднароднасці колеру.

— Шчыра кажу: праца мне вельмі падабаецца, — зазначае дзяўчына. — Па-першае, яна ўнікальная — пасля распаду СССР гэта лабараторыя засталася адзіная ва ўсёй нашай краіне. Таму падобны досвед больш нідзе не атрымаеш. З мінусаў я б адзначыла фізічную стомленасць — валакно вельмі тонкае, усяго дзевяць мікрон (у пяць-дзесяць разоў танчэйшае за чалавечы волас), ад гэтага хутка стамляюцца вочы. Але я актыўна баўлю час — удзельнічаю ў рабоце валанцёрскага атрада «Сэрца «Паліміра», Савета маладых работнікаў прадпрыемства, займаюся наборам каманд на розныя кшталту турніры, у многіх удзельнічаю сама. Нядаўна, напрыклад, ездзіла на Рэспубліканскі турзлёт прафсаюзаў на турбазу «Высокі Бераг».

Лабаранты працуюць у тры змены па графіку «два праз адзін». На заробак Алена не скардзіцца, кажа, што грошы плацяць добрыя. Прадпрыемства дало інтэрнат.

— Летась я завочна скончыла Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «інжынер-хімік-эколаг». У будучыні бачу сябе толькі на «Паліміры», — канстатуе Алена. — Да моладзі на прадпрыемстве ставяцца добра, ёсць магчымасці не толькі для прафесійнай самарэалізацыі. Таму мяне тут усё задавальняе.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Наваполацк — Мінск.*

# ХТО ЎМЕЕ КІРАВАЦЬ ГУКАМ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Далей я даведваюся, што пульты бываюць аналагавыя і лічбавыя. У клубе — апошні: Насця паказвае планшэт, на якім у адмысловай праграме адлюстроўваецца ўсё, што адбываецца на пульце. Галоўны гукарэжысёр рухае фэйдар — гэта імгненна адлюстроўваецца на экране. Можна і наадварот рабіць — з праграмы кіраваць пультам.

Мы не выпадкова прыехалі так рана: у пустой зале пачынаецца саўндчэк — праверка перад канцэртам. Гэты працэс расцягваецца на гадзіну: трэба наладзіць тэхніку і інструменты, расставіць мікрафоны, але галоўнае — настроіць гук.

Першым за сваёй устаноўкай аказаўся барабаншчык — яго просяць сыграць на кожным барабане па чарзе, каб знайсці «бракаваныя» гукі і панізіць іх частоты на эквалайзеры. Потым ён выконвае кавалак з песні, дзе гучаць усе барабаны разам. Далей Насця просіць сыграць максімальна гучна.

— Гэта каб гук не «пікаваў», — тлумачыць дзяўчына. — Калі адбываецца перавышэнне гучнасці сігналу, пачынаецца яго скажэнні: ён трашчыць, хрыпіць.

Такія ж тэсты праводзяцца з усімі інструментамі па чарзе. Наладжваюць і мікрафон вакаліста, а потым просяць усю групу сыграць разам.

— Інструмент асобна можа гучаць добра, а сярод іншых — выбівацца. Таму трэба таксама паслухаць, як яны граюць разам, — кажа Насця. — Але тут шмат залежыць ад саміх музыкаў і іх стылю: барабаны для джаза і для рока павінны гучаць зусім па-рознаму.

Нарэшце саўндчэк скончаны, зала пачынае напаўняцца наведвальнікамі.

— І чым табе займацца ўвесь канцэрт? Усё ж ужо зроблена...

— Сачыць і наладжваць гук далей, — усміхаецца Насця. — Саўндчэк робіцца пры пустой зале, а потым прыходзяць гледачы, і акустычная сітуацыя мяняецца. На гук уплывае ўсё: і колькасць людзей, і дзе яны стаяць, асабліва на вялікіх арэнах... Музыкі таксама ўплываюць на гук: струны разаграюцца, галасы садзяцца, а ў выніку змяняюцца частоты. Заўважала, што на канцэртах у першых песень гучанне звычайна «не вельмі»? Таму падчас першых трэкаў гукарэжысёр карэктуе «памылкі».

— Добра, а потым што яму рабіць?

— Гукарэжысёр, напрыклад, можа падкрэсліваць моманты кульмінацыі. Слухае, сочыць за песняй, і перад самым «моцным» момантам робіць спачатку трошкі цішэй, а потым гучней, і гэты «ўдар» эмацыянальна ўплывае на слухачоў. Яшчэ ён можа хутка зрабіць так, каб людзі пачалі танцаваць.

**«Музыкі таксама ўплываюць на гук: струны разаграюцца, галасы садзяцца, а ў выніку змяняюцца частоты».**

— Гэта як?

— Глядзі, — усміхаецца Насця. — У трэку для танца павінна быць пульсацыя. Яна ствараецца «арэлямі» паміж рабочым і вялікім барабанам: «тум-тышч, тум-тышч». Калі падкрэсліць удары вялікага барабана, гэтая пульсацыя ўзмацняецца. Дзяўчына кранае нешта на


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

планшэце, гук паступова робіцца сакавітым, гукі барабанаў больш «тум-тышч», а я сачу за публікай і бачу невялікі цуд на свае вочы: менш чым за паўхвіліны натоўп пачынае рухацца значна больш актыўна. Насця глядзіць на мой твар і смяецца, але раптам у вакаліста гучна віскоча мікрафон: людзі затыкаюць вушы, а яна зноў хутка кранае планшэт, і непрыемны гук знікае.

— Гэта была зваротная сувязь, — расказвае гукарэжысёр. — Такое адбываецца, калі сігнал з дынаміка занадта гучна трапляе ў мікрафон і той вішчыць, бо гук «скача» паміж ім і дынамікам. Каб усё скончыць, я шукаю па спектрах на экране, дзе з'явіўся віск, і паніжаю гэтую частату.

Праз пару гадзін канцэрт заканчваецца, але Насця не кідае свой пост:

— Ніколі не ведаеш, ці не выклікаюць музыкантаў на біс, таму трэба чакаць далей.

І сапраўды, гурт вяртаецца хвілін праз пяць і выконвае яшчэ дзве кампазіцыі. Наведвальнікі доўга апладзіруюць, потым нарэшце, пачынаюць пакідаць залу. Гэта апошні этап работы гукарэжысёра: пакуль музыканты збіраюць інструменты, Насця складае мікрафоны, выключае пульт і ўзмацняльнікі для гітар.

...Выходзім на вуліцу а палове на дванаццатую. Пытаюся:

— А чаму мы ўвесь час былі з планшэтам у зале, а не за пультам?

— Там музыка лепш чуваць. А ў гукарэжысёрскай каморцы гук «хлусіць», — тлумачыць Насця і смяецца. — Ты так і напішы: калі наступны раз пабачыце на канцэрце чалавека, які ўвесь час стаіць і глядзіць у планшэт, ведайце: гэта не залежнік сацсетак, а гукарэжысёр.

**Кацярына ЖОРАВА,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**




# Юнкары, увага!

**У сённяшнім выпуску маладзёжнага дадатку мы публікуем апошнія з найлепшых «проб пяра» юных і маладых няштатных аўтараў, што былі дасланыя на конкурс. Творчы марафон, які доўжыўся на працягу навучальнага года, скончаны. На жаль, не ўсе з пачаткоўцаў пабачылі надрукаванымі свае работы, паколькі яны не адпавядалі ўмовам конкурсу. З іншага боку, самыя вартыя з іх змяшчаліся на старонках «Чырвонкі. Чырвонай змены» як звычайныя журналісцкія матэрыялы. Самыя актыўныя і настойлівыя аўтары за тыя месяцы, што ішло творчае спаборніцтва, змаглі папоўніць сваё асабістае партфоліа дзвюма-трыма, а тое і чатырма «пробамі пяра».**

Калі гаварыць пра ўдзельнікаў у цэлым, найлепш праявілі сябе тыя з іх, хто займаецца журналістыкай у гуртках, часта — не першы год. Геаграфічна «пальма першынства» тут каторы год запар належыць канкурсантам з Маладзечна — з «Маладзіка». Шкада, што ў конкурсе гэтага сезона не было прадстаўнікоў з Мазыра, якія яшчэ нядаўна актыўна ў ім удзельнічалі. Не атрымалі мы ніводнай «пробы пяра» і з Наваполацка. Здае ў гэтым сэнсе пазіцыі і Ліцэй БДУ... Зноў жа варта адзначыць амаль што выключна дзявочы састаў удзельнікаў конкурсу, прынамсі, усе апублікаваныя найлепшыя работы належаць толькі выпускніцам старэйшых класаў. Таму не цяжка будзе здагадацца, што пераможцам (ці пераможцамі) стане нехта з прыгожым дзявочым імем.

Яго мы назавём у наступным нумары «Чырвонкі. Чырвонай змены». Аўтар, ушанаваны рэдакцыйным журы, апроч ганаровай граматы ад «Выдавецкага дома «Звязда» атрымае памятныя прызы з сімволікай найстарэйшай беларускай штодзённай грамадска-палітычнай газеты, якая сёлета, літаральна праз паўтара месяца, адзначыць свой 100-гадовы юбілей. А яшчэ, калі пераможца будзе паступаць на журфак сёлета, і рэкамендацыю ад нашага выдання.

Нам жа пакуль застаецца толькі падзякаваць за ўдзел у конкурсе ўсім, хто дасылаў на працягу навучальнага года свае «пробы пяра». Мы пазнаёміліся з новымі аўтарамі, былі рады атрымаць матэрыялы ад тых, хто пісаў другі-трэці год запар. Спадзяёмся, і нашым удзельнікам чарговы творчы конкурс дадаў прафесійнага досведу. Паўтараем заўсёднае: нават калі нехта не стаў пераможцам, ён усё роўна не прайграў. Удзел — гэта ўжо перамога! Да новых сустрэч, юнкары, да новых конкурсаў! А тым, хто сёлета збіраецца паступаць на журфак, удачы!

**Куратары праекта Надзея НІКАЛАЕВА, Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЗАКАХАНАЯ Ў ПАЭЗІЮ



**Ганна Шакель — маладая паэтка, якая размаўляе і піша вершы па-беларуску. Яна з'яўляецца фіналісткай конкурсу фонду Роберта Боша, і адзін з яе твораў перакладзены на нямецкую мову і надрукаваны ў зборніку ў рамках праекта «Літаратурныя спатканні».**

— Прыемна асэнсоўваць, што я ўвайшла ў дзясятак маладых паэтаў, вершы якіх адабралі, каб прадставіць нямецкім чытачам сучасную паэзію Беларусі, — усміхаецца Ганна.

У трынаццаць гадоў дзяўчына захаплялася журналістыкай, думала, што гэта яе будучыня. Але паспрабаваўшы на практыцы, зразумела, што характар не вельмі адпавядае дынамічнасці прафесіі.

— Цяпер я вучуся ў МДЛУ на факультэце англійскай мовы, але кім хачу працаваць, яшчэ не ведаю, — прызнаецца студэнтка.

У школьныя гады паэзію яна наогул не любіла, больш падабалася чытаць прозу.

— Я не разумела, як можна захапляцца вершамі. Але потым мяне запрасілі рыхтавацца да алімпіяды па беларускай мове, дзе адным з заданняў з'яўляецца напісанне водгуку на паэтычны твор, — успамінае дзяўчына.

Ганна стала практыкавацца, спачатку ў яе не вельмі атрымлівалася, але менавіта праз водгукі яна палюбіла чытаць вершы.

— Ніхто табе не скажа, ці правільна ты зразумеў тое ці іншае слова, ты проста ўзаемадзейнічаеш з творам і бачыш адлюстраванне стану сваёй душы на той момант у тэксце, — кажа дзяўчына.

Адной з першых паэтычных кніг, якія адкрылі для яе свет паэзіі, быў зборнік Рыгора Барадуліна «Лепей»:

— Я памятаю, як узяла яго ў рукі і проста не змагла адарвацца. І так паступова пачала ўсё больш цікавіцца беларускай літаратурай, асабліва сучаснай. Аднойчы мне трэба было напісаць эсэ. Я надрукавала некалькі радкоў і зразумела, што там занадта шмат лішніх слоў. І перарабіла тэкст у верш, бо толькі паэзія можа ёміста выразіць думку ці пачуццё. Так нарадзіўся мой першы твор.

А потым наша гераіня проста закахалася ў паэзію. Праз эмоцыі яна глядзела на свет інačай, востра ўспрымаючы ўсе дэталі, якія потым станавіліся падставай для твора. І Ганна пачала шмат пісаць. Летась, у верасні, яе вершы надрукавалі ў часопісе «Маладосць».

— Да сваіх твораў я стаўлюся больш сур'ёзна, чым проста, як да хобі: хочацца бачыць у іх мастацтва. Маме і сябрам яны падабаюцца, а некаторыя кажуць, што іх часам цяжка зразумець. Але ў гэтым і ёсць сэнс — скокнуць вышэй за сваю галаву, сягнуць за край вядомага, — лічыць паэтка.

**Валерыя ЛУЖЫНСКАЯ,<br>вучаніца 9 класа<br>гімназіі-каледжа<br>мастацтваў г. Маладзечна.**

### ПРА АЎТАРА

Гэта ўжо не першая «проба пяра» на нашым конкурсе 15-гадовай аўтаркі. Нічога дзіўнага ў такой настойлівасці няма: Валерыя ў будучыні марыць стаць журналістам, таму крок за крокам ідзе да сваёй мэты.

— Я люблю наведваць розныя выстаўкі, тэатр. Таксама захапляюся музыкай. Мне падабаецца браць інтэрв'ю, — расказвае пра сябе дзяўчына. — А яшчэ люблю паэзію, таму выбрала гераіняй свайго матэрыялу юную паэтку. У людзях цаню адкрытасць і добразычлівасць.

# Мастацтва гармоніі

## Яго знайшла сям'я маладых мастакоў

**Мне пашчасціла пазнаёміцца з сям'ёй таленавітых мастакоў — Андрэем і Веранікай Руско. Нават не толькі пазнаёміцца, але і пабываць у іх майстэрні.**

Любоў да малявання прысутнічала ў абаіх з дзяцінства. Андрэй лічыць, што мастацкія здольнасці перадаліся яму ад бацькі. Яго тату падабалася маляваць тэхніку, і ён перыядычна браўся за пэндзаль. А Андрэй з братам паўтаралі і перамалёўвалі. Бацькі заўважылі талент сваіх дзяцей і адправілі ў мастацкую школу. Ужо будучы школьнікам Андрэй маляваў плакаты да свят, пакуль аднакласнікі гулялі на вуліцы. А яго самая першая карціна алеем была падарункам для маці.

Пасля школы некалькі разоў хлопец спрабаваў паступаць у мастацкія навучальныя ўстановы ў Гродне і Віцебску, але безвынікова: творчую работу выконваў на пяць (па пяцібальнай сістэме), а з мовай і літаратурай узнікалі цяжкасці. Але гэта не спыняла маладога чалавека, і пазней ён усё ж такі скончыў універсітэт. Яшчэ да таго, як Андрэй адслужыў у арміі, і да таго, як сустрэўся са сваёй будучай жонкай, пінчанін удзельнічаў у рэспубліканскім конкурсе «Машына часу», дзе яго работа ўдастоілася другога месца. Гэта і быў першы поспех...

Вераніка таксама таленавітая мастачка. Нарадзілася ў Сібіры, у Алтайскім краі. У Пінск трапіла яшчэ падлеткам... Таксама як і Андрэй, малявала з дзяцінства і ведала, што будзе мастаком. Скончыла пінскі каледж лёгкай прамысловасці па спецыяльнасці «тэхнік-тэхнолаг», тут жа цяпер працуе педагогам. Малюе ў тэхніцы батык, з якой пазнаёмілася ў 2002 годзе. Па сённяшні дзень яе не перастае здзіўляць гэты напрамак у мастацтве. Вераніка, як сапраўдная жанчына, любіць маляваць усё яркае, лёгкае: кветкі, матылькоў. У гаме пераважаюць халодныя колеры — фіялетавы, блакітны, пурпурны, сіні. Мастачка імкнецца да таго, каб яе работа была пярэстай плямай у інтэр'еры.



### ПРА АЎТАРА

